№ 44 (354) 28 лістапада 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы



**Тры месяцы да будучыні**
Сачыненьне Івана Т., вязьня выхаваўчай калёніі №2 Бабруйску.
старонкі 10–11

**Віктар Івашкевіч**
«Цяпер я скараход».
старонка 14

**Рэвалюцыя ў добрым гусьце**
«Круглы стол» у Рэдакцыі «НН».
старонкі 6–7

### Нязначныя саступкі «Газпрому»

**У Менску ў сераду за зачыненымі дзьвярыма прайшоў другі раўнд перамоваў Беларусі з «Газпромам» аб пастаўках газу.** Газавага манапаліста прадстаўляў старшыня праўленьня Аляксей Мілер. Беларусь — Лукашэнка і Сідорскі. Урад разьлічвае на цану, роўную 44 USD за 1000 куб.м (сёлета мелі 29 USD). Адзіная вiдавочная саступка беларускага боку ў справе прыватызацыі «Белтрансгазу» — гатовасьць продажу акцыяў «Газпрому» ў растэрміноўку на 4—5 гадоў у кошт паставак газу.

### Бабры атакавалі крэпасьць-герой

**На тэрыторыі мэмарыялу «Берасьцейская крэпасьць-герой» моцна размножыліся бабры.** Яны вынішчылі ўсе асіны і ўзяліся за каштоўныя дрэвы, у тым ліку белую вярбу, занесеную ў Чырвоную кнігу. Вада з запрудаў, створаных жывёламі на Мухаўцы, пагражае падтапіць казэматы-музэі. Дырэктар музэю дабіваецца ад міністра аховы прыроды дазволу на адстрэл зьвяркоў, якія й самі — у Чырвонай кнізе.

### Вешнякоў забараніў кліп «Красак»

**Цэнтравыбаркам Расеі забараніў паказ новага кліпу гурту «Краскі» на песьню «Аранжавае сонца».** Там некалькі разоў паказаны яблык, што Цэнтравыбаркам палічыў сукрытай рэклямай дэмакратычнай партыі Яўлінскага напярэдадні выбараў у Дзярждуму.

### Ліцэісты ў Кіеве

**21—23 лістапада дэлегацыя навучэнцаў Беларускага ліцэю наведала Кіеў па запрашэньні ўкраінскіх студэнцкіх суполак.** Наступнае падарожжа мае быць у Літву, на гэты раз з дапамогай літоўскіх сяброў Беларусі.

### Паўночнае зьзяньне над Беларусяй

**У «НН» зьвярнуўся чытач з-пад Горадні, якому пашчасьціла назіраць паўночнае зьзяньне.** «Няўжо толькі я адзін бачыў паўночнае зьзяньне ў Беларусі 20 лістапада з 21 да 22.30 гадзіны? Нідзе ніхто не азываецца пра гэта», — піша ён. Мо яшчэ каму з чытачоў пашчасьціла? Лістуйце ў «НН». Фэнамэнальныя паўночныя зьзяньні гэтай восеньню выкліканыя незвычайнай сонечнай актыўнасьцю, апошні пік якой прыпаў на мінулыя чацьвер—пятніцу.

**АШ; БелаПАН**

# Урокі грузінскае



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Старонкі 3–7.**

## Шляхціц з-пад Ашмяны



**Тарчэўскі Ян (Іван)** (10 кастрычніка 1881 г. — 29 верасьня 1929 г.) нарадзіўся ў засьценку Асінаўка Ашмянскага павету. Беларускі адраджэнец нашаніўскай пары. На пачатку свайго самастойнага жыцьця Ян Тарчэўскі быў даверанай асобай — камісарам, кіраўніком маёнтку Варата Санкт-Пецярбурскай губэрні Лугаўскага павету ў палкоўнічыхі Ганэнфэльт (аднак нядоўга). Кінуўся ратаваць спуджаных коней, і палкоўнічыха яго звольніла: «Гэта павінны былі рабіць мужыкі, а ты ў мяне кіраўнічы». Неўзабаве вярнуўся на родную Ашмяншчыну. **Старонка 12.**

### «Наша Ніва» і «Arche» ў Гомелі

**28 лістапада а 17.30 у канфэрэнц-залі Гомельскай абласной бібліятэкі (пл.Перамогі, 2) адбудзецца сустрэча з рэдактарамі і аўтарамі «Нашай Нівы» ды часопісу «ARCHE». У сустрэчы бяруць удзел Валер Булгакаў, Сяргей Балаханаў, Сьвятлана Курс, Віталь Сіліцкі, Андрэй Хадановіч. Сьпявае Сяржук Мінскевіч. Запрашаем!**

## Ізноў Пінігін

**Спэктакль Мікалая Пінігіна «№13 (поўная бязглуздзіца)» паводле п'есы Рэя Куні нагадвае бляшанку зь печывам, упрыгожаную выявамі лёнданскіх краявідаў. Высакаякасны, стылёвы прадукт. Прэм'еру іграюць у Доме афіцэраў.**

На сцэне — густоўныя дэкарацыі ў бяспройгрышным «брытанскім стылі» (сцэнаграфія Зіновія Марголіна). Уваходы і шафа ў выглядзе чырвоных тэлефонных будак, клятчастая шатляндка на пледах і канапах, брытанскі сьцяг на фіранках і нават майтках, Біг-Бэн за акном.

Нягледзячы на «брытанскую» аздобу, спэктакль далёкі ад стэрэатыпнасьці. Глядзіцца ён лёгка й успрымаецца як камэдыя па-за часам і межамі. Сюжэт пабудаваны на даволі тыповых сытуацыях, якія ў гэтай п'есе, аднак, набываюць нетыповае разьвіцьцё.

Памочнік прэм'ер-міністра Рычард Уільлі (Ігар Забара) здымае ў гатэлі нумар (№13), каб правесьці ноч з маладой сакратаркай Джэйн Уорзынгтан (Ганна Хітрык). Жонцы ж (Зоя Белахвосьцік) Рычард паведамляе, што ўсю ноч будзе на дэбатах у парлямэнце. Трымаць сп.Уільлі ў курсе парлямэнцкіх справаў павінен ягоны памочнік Джордж Пігдэн (Аляксандар Малчанаў).

Палюбоўнікі ўжо гатовыя прадэманстраваць адно аднаму моц сваіх пачуцьцяў, як раптам за фіранкай яны знаходзяць прыдушанага аконнай рамай чалавека ў капелюшы й чорных акулярах (Генадзь Фомін, Павал Адамчыкаў). Уільлі тэрмінова выклікае Джорджа, які мусіць пазбавіцца ад трупа. Мамчын сынок Джордж у шоку ад цынізму свайго начальніка, заракаецца галасаваць за ягоную партыю. Але, пакуль тое, Джордж будзе вымушаны сядзець у шафе зь нябожчыкам, лазіць па бальконах з Джэйн на руках, танчыць з трупам, выступаць у ролі доктара, спакушаць жонку начальніка, гэтаксама як і сядзелку сваёй маці Глэдыс (Вольга Фадзеева, Сьвятлана Анікей), зь якой урэшце ажэніцца.

**Працяг на старонцы 12.**

# Як апляваць дэпутата

## Досьвед Белаазерску



**Юры Губарэвіч — асабісты вораг вертыкалі**

23 лістапада ў Белаазерску адбыліся давыбары ў гарсавет. Дэмакратычныя кандыдаты прайгралі ў 10 з 12 акругаў. Улада дасягнула гэтага праз кампанію «чорнага піяру» супраць сваіх апанэнтаў. На гэта не пашкадавалі дзяржаўных грошай і сілаў. Як гэта рабілася?

У раёнцы «Маяк» напярэдадні выбараў дэмакратычных кандыдатаў называлі нашчадкамі Гёбэльса. У кожную паштовую скрынку закінулі ксэракопіі артыкулу з абласной газэты «Заря», дзе пра сёньняшняга намесьніка старшыні райсавету Юрася Губарэвіча гаварылася, што ён мае шыкоўны маёнтак, езьдзіць на іншамарцы і мае ўсе аксэсуары «новага беларуса». Ю.Губарэвіч зьбіраецца зьвярнуцца ў суд.

Акрамя газэт, было распаўсюджана пяць відаў розных улётак, падпісаных «група выбаршчыкаў» і без выходных зьвестак (што парушае выбарчы кодэкс), у якіх, у прыватнасьці, сьцьвярджалася, што дэмакратычныя дэпутаты хочуць адмяніць Дзень перамогі.

Застаецца толькі здагадвацца, што будзе на парлямэнцкіх выбарах, бяруцца за галаву назіральнікі ад Беларускага Хельсынскага камітэту.

З дробязяў: адну з выбарчых камісій узначальвала старшыня, прыцягнутая да адміністрацыйнай адказнасьці за парушэньні пасьля мясцовых выбараў у сакавіку.

Белаазерск перастаў быць адзіным горадам, дзе большасьць абраных дэпутатаў складалі прадстаўнікі апазыцыі. За той час, калі горад энэргетыкаў быў выспай дэмакратыі, мясцовы савет пасьпеў прыняць пастанову аб ільготным выдзяленьні жытла для маладых спэцыялістаў у каапэратывах, упарадкаваць працу міліцыі і мэдустановаў.

На Дзень энэргетыка 22 сьнежня горад з нармалізаваным гарсаветам наведае А.Лукашэнка. Віншуем піяршчыкаў і легкаверных выбарцаў.

**ВДз**

АД РЭДАКЦЫІ

# Шэварднадзэ заслужыў пашану

Няма ў палітыцы нічога цяжэйшага, чым адысьці ў час.

Яшчэ ў канцы мінулага тыдня ўсім здавалася, што апазыцыя выдыхлася, а Шэварднадзэ выйграе ў складанай гульні супраць Вашынгтону з эківокамі ў бок Масквы. У нядзелю ж сьвет абляцелі кадры, як дрыжаць паперкі ў руках прэзыдэнта, калі ён уцякае з залі парлямэнту. Ужо, наадварот, Шэві здаўся адарваным ад рэчаіснасьці, адсталым ад часу, пакрыўджаным старым, якім кіруюць ягоныя ўласныя ахоўнікі. Сьвет затаіўся, чакаючы крыві і вайны. Здавалася, што Шэві растрынькае рэшткі рэпутацыі, якую — справядліва ці несправядліва — ён займеў за гады цяжкое працы. Думалася, што ён, як прэзыдэнты іншых абломкаў імпэрыі, прыклад аднаго зь якіх у нас перад вачыма, будзе біцца за ўладу да канца, нават шкодзячы нацыянальным інтарэсам краіны. Бо ўлада для іх — сэнс жыцьця.

Аднак у апошні момант Шэварднадзэ давёў, што заслужыў добрае слова ў падручніках гісторыі. Бо адышоў. Запозна, але мірна адышоў. Прабыўшы прэзыдэнтам адзінаццаць гадоў. Нягледзячы на вастрыню мінулага месяца — ці не пачэсны канец кар'еры?

Ня выключана, што ён яшчэ вернецца. Масква прадказвае хаос у Грузіі. Таму досьвед і сувязі Шэварднадзэ яшчэ спатрэбяцца самаўпэўным маладым вучням Сівога Ліса.

**Барыс Тумар**

НОВАЯ РУБРЫКА WWW.NN.BY

# Свая хваля

«Наша Ніва» не гумовая. Яна папяровая, і мае пакуль толькі 16 старонак. На іх фізычна ня могуць зьмясьціцца ўсе матэрыялы, што прыходзяць на адрас Рэдакцыі. Адгэтуль Вашыя артыкулы, камэнтары, ідэі, навіны, якія з тых ці іншых прычынаў ня трапілі ў газэту, марнець у архівах ня будуць. Усім знойдзецца месца на «Сваёй хвалі». «Свая хваля» — гэта новая рубрыка, якая адчынілася на сайце «НН», некалькі дадатковых віртуальных старонак штотыдня. «Свая хваля» вольная ад карэктуры і рэдактуры. Стрэнемся на «Сваёй хвалі»! Абнаўленьне штопанядзелак. Пішэце на nn@promedia.by.

Загалоўкі «Сваёй хвалі» на гэтым тыдні: «Ці правільны я патрыёт?», «Viza Незалежнай Рэспублікі Мроя. Трыб'ют «N.R.M.», «Вялейская восень Пушкіна», «Эвалюцыя дзяржпрадпрыемстваў і калгасаў ва ўмовах рынкавай эканомікі».

# Гомагенізацыя ад актора грамадзянскай супольнасьці

**25 лістапада Фундацыя Фрыдрыха Эбэрта прэзэнтавала дасьледаваньне пад гучнай назвай «Нацыянальная ідэнтычнасьць Беларусі».**




Адзіны нямецкі аўтар брашуры Тыла Баер праводзіць думку, што няма кампанэнтаў, па якіх можа ісьці разьмежаваньне нацыянальнай ідэнтычнасьці беларусаў ад расейцаў, і няма эканамічных падставаў для гэтага. Ён называе ілюзіяй перакананьне, што менавіта «нацыяналістычная курыца можа выседзець яйка грамадзянскай супольнасьці».

**Працяг на старонцы 12.**

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Крытыка чыстага маразму



Калі ўжо рабіць з Казуліна херувіма, дык рабіць творча.

У працоўнай кніжцы Марціна Гайдэгера быў ганебны запіс: «1933—34 г. — рэктар Фрайбурскага ўнівэрсытэту». Гер Марцін ніколі ня быў нацыстам. Не складаў праскрыпцыйных лістоў на студэнтаў, застуканых у час лекцый у туалеце за рытуалам абразаньня. Не патрабаваў ад філфакаўцаў кагалам уступіць у Гітлерюгенд, калі яны жадаюць здаць зімовую сэсію. Не выганяў інтэрнаты датэрмінова галасаваць на рэфэрэндуме аб ненападзе паміж Нямеччынай і Рэспублікай Тува.

Гайдэгер ціха трымаў у кабінэце павуковы штандар і засьвяціўся на фота зь нейкім групэнфюрэгаднунтэрфюрэрам падчас нейкага прахаднога мерапрыемства.

Нягледзячы на гэта, пасьля вайны дэмакратычная публіка доўга шарахалася ад «скінгеда Гайдэгера». Урэшце яму даравалі, лягічна разважыўшы, што адкрыцьцё фэнамэналягічнага кірунку ў экзыстэнцыялізьме пераважвае памылкі маладосьці.

Уся гэта байка да пытаньня, што рабіць з былым рэктарам БДУ — сп.Казуліным. У часы сваёй кадэнцыі ён падпісваў вымовы студэнтам — ўдзельнікам акцый апазыцыі, дапамагаў мукамолу ладзіць рэкруцкі набор, заганяў студэнтаў на ліпавыя выбары. Аднак у кантэксьце новай палітычнай каньюнктуры правыя вырашылі сьпісаць Казуліну ўсе грахі. Нават замах рэктара на маёмасьць клоўна Рональда — самы страшны ўчынак паводле лібэральных раскладаў, які здольны зрабіць народжаны ад жанчыны.

Герольды лібэральнай прэсы ў адзін голас называюць Казуліна «интеллектуалом западного типа, способным организатором и либерально настроенным человеком». Лібэральнасьць зьвязаная з наступнымі дасягненьнямі Казуліна: радыё «Юністар», дызайн гербу БДУ, гонкі на матацыкле, элегантны фрак і нават «фирменные бланки сомнительного качества, но на хорошей бумаге».

Сьмешна, спадары дэмакраты. Вунь Лукашэнка тры тэлеканалы скляпаў. Дык што, яго таксама называць «интеллектуалом западного типа»? Калі ўжо рабіць з Казуліна херувіма, дык рабіць творча. Чаму не пусьціць мульку, што ён поруч з К'еркегорам, Ніцшэ, Бадлерам і Прустам зрабіў вялізную інвэстыцыю ў разьвіцьцё фэнамэналёгіі. Вось як прыкладна мог бы выглядаць казулінскі лубок у зборніку «Хто ёсьць хто сярод самых-самых дэмакратычных дэмакратаў Беларусі».

«Быцьцё Казуліна ў фатэлі рэктара БДУ ня мае нічога супольнага з траекторыяй шэрай бюракратычнай манады. Уся яго практыка імпліцыявалася глябальным пытаньнем аб сэнсе жыцьця асобы і ўнутранай аўтаноміі. Для таго, каб прыцягнуць увагу студэнтаў да праблемы існага, Казулін мадыфікаваў прысутнасьць студэнтаў у БДУ як сродак актуалізацыі асобы. У гэтым яму дапамагла філязофская катэгорыя жаху. У БДУ зьявілася ахова, удзельнікаў акцый шантажавалі выключэньнем, стаў больш жорсткім рэжым наведваньняў лекцый... Экстазісная тэмпаральнасьць дасягалася за кошт вызваленьня ад такой прымітыўнай самарэфэрэнтнасьці, як спажываньне гамбургераў. Трансляваўшая безьлічную колькасьць раз песьню «Подождем тваю мать!», казулінскае радыё папулярызавала ў студэнцкіх колах тэзу аб несуадносьнасьці часу і прысутнасьці. Апошнім нерэалізаваным праектам беларускага Бадлера было прымусовае ўвядзеньне картак ID і сыстэмы кампутарнага кантролю — мэтафізычны сродак катарсысу, які павінен праходзіць кожны студэнт пры ўваходзе ў альма-матэр. Кажучы «Я чалавек прэзыдэнта», рэктар казаў аб іншым, аб быцьці з іншымі (Mit-sein)...» Ну і гэтак далей.

Вось як павінна выглядаць індульгенцыя для былога лукашыста. Гэта вам не «язда на матацыкле». З такой біяграфіяй Казуліну хоць зараз у адзіныя кандыдаты ад апазыцыі.

**Лёлік Ушкін**

ІНАКШ КАЖУЧЫ

# Аксаміт для народу

Агульнапрызнаны факт: Грузія няблага пачувалася ў агульнасаюзным падзеле працы. Ня будзе памылкаю сказаць такое ж пра Беларусь. Грузіны, вельмі незадаволеныя вынікамі кіраваньня свайго лідэра з старой намэнклятуры, гатовыя пайсьці за маладым і энэргічным красамоўцам, барацьбітом з карупцыяй. (Міхаілам Саакашвілі, калі нехта падумаў пра кагосьці іншага.)

Партыя змагара з карупцыяй — былога міністра юстыцыі і дзейнага кіраўніка гарадзкое рады Тбілісі — не перамагла на выбарах, і ён быў вымушаны перайсьці да мэтадаў «аксамітнае рэвалюцыі».

На шчасьце, яны далі вынік. Кроў не пралілася.

За час незалежнасьці Грузія атрымала плойму заходніх грошай, выйшаўшы на суме амэрыканскае дапамогі на душу насельніцтва на другое месца ў сьвеце пасьля Ізраілю, і энэргічна дэманстравала сваё жаданьне далучыцца да заходніх каштоўнасьцяў, распачаўшы праграмы рэфармаваньня шмат якіх дзяржаўных інстытутаў. Вынік такі, што назва краіны сталася сымбалем карупцыі, а вялікі паўночны Сусед выказвае ўсе прыкметы занепакоенасьці магчымай стратай уплываў.

Найбольшыя праблемы ў дачыненьнях з Суседам выклікаюць, як лёгка здагадацца, трубаправоды: прыкладам, газавы Баку—Тбілісі—Эрзэрум і нафтавы Баку—Тбілісі—Джэйхан. Яны яшчэ недабудаваныя, і нафта-газ па іх пойдуць не суседзкія, але якраз гэтая суцэльная недалучанасьць клапоціць і дражніць былую звышдзяржаву: магутная манапольная Труба — ледзьве ня ўсё, што ў яе засталося, калі казаць пра вялікую палітыку.

Вось жа ў параўнаньні зь беларускай электаральнай рэвалюцыяй 1994 г. падзеі 2003 г. у Грузіі падаюцца зусім не такімі вытанчана цывілізаванымі. А што празаходняга старога дзеяча зьмяніць ультразаходні і малады, з дэмагагічным стылем маўленьня — і гэтым нас ня зьдзівіш. Дый дытырамбы народнай мудрасьці бадай што не належаць да рарытэтаў.

Можна нават прадказаць, на падставе ўласнага досьведу, да чаго варта рыхтавацца. Самае цікавае наперадзе, калі ацічхне аксамітны энтузіязм і выбарцам захочацца ўпікнуць маладога кіраўніка, праграма дзеяньняў якога на першы погляд вельмі нагадвае абяцаньні нешта запусьціць ды некага загнаць у Гімалаі. Вось калі людзям зноў захочацца пачуць справаздачу, а не абяцаньні — і час гэты не такі далёкі, як можа здавацца, — рэвалюцыйны аксаміт чакае цяжкое выпрабаваньне на якасьць.

Спадзяваймася, што ў Грузіі будуць прызначаныя і пройдуць, як належыць, выбары, на якіх грамадзяне сапраўды будуць мець магчымасьць выбіраць. Але вельмі верагодна, што ў цэнтар выбару палітыкі паспрабуюць зьмясьціць харызматычную асобу, упэўненую ў сваёй здольнасьці адным махам вырашыць усе праблемы. «I am ready to deal with that mess», — прызнаўся Саакашвілі (ён ахвотна гаворыць на мове магутнага сябра).

«I am ready to deal with that mess», — прызнаўся Саакашвілі.

У публічнай палітыцы здараюцца сытуацыі, калі цалкам дарэчнае пытаньне «А як вы зьбіраецеся гэта рабіць?» гучыць не да месца, але хвіля праходзіць, а пытаньне застаецца. Калі ж бурлівая зьмена кіраўнікоў не прадугледжвае радыкальных зьмяненьняў стратэгічнага курсу краіны, забываца на непрыемнае «як?» легкадумна і небясьпечна.

Ёсьць верагоднасьць паглыбленьня падабенстваў паміж Беларусяй і Грузіяй, нягледзячы на тое, што адна краіна ўстойліва глядзіць на Захад, а другая — на Ўсход. Геаграфія: гэткім чынам яны пазіраюць адна на адну. Самы час пажадаць жыхарам Грузіі посьпехаў і шанцаваньня.

**Аляксандар Карольчык**

# Ці магчыма гэта ў Беларусі?

**Грузія месьціцца ў геаграфічнай Азіі, за хрыбтамі Вялікага Каўказу. Азія мае спакусьлівы й каўткі водар. Зямля тут пахне самавітымі пладамі сонца, а паветра настоенае на сотнях стагодзьдзяў цывілізацыі. Гісторыя незалежнасьці Грузіі сягае ажно ў антычныя часы. Гісторыя тутэйшага хрысьціянства ў два разы даўжэйшая за нашую. Першае яскравае адрозьненьне тутэйшага палітычнага жыцьця ад нашага — нацыянальнае самавызначэньне. Яшчэ ў савецкія часы тутака панаваў культ сваіх цароў, якім ставіліся сацрэалістычныя помнікі. Ніводзін з грузінскіх палітыкаў ніколі не сумняваўся ў самадастатковасьці Грузіі й велічы яе культуры. Уявіць сабе, што Шэварднадзе стаў бы кпіць з грузінскае мовы, як Лукашэнка зь беларускай… проста нерэальна. Хоць і Лукашэнка гаворыць па-расейску з моцным акцэнтам.**





**Сямён Шарэцкі, старшыня Вярхоўнага Савету XIII скліканьня, зьвяртаецца з заклікам разыходзіцца па хатах да людзей на пл.Незалежнасьці ў Менску, што прыйшлі на абарону Вярхоўнага Савету ў лістападзе 1996.**

AP

# Рэвалюцыя ў добрым гусьце

Апошні грузінскі лідэр не замахваўся ані на канстытуцыю, ані на дзяржаўны статус краіны. Не зважаючы на сваё зорнае савецкае мінулае, Шэварднадзэ быў пасьлядоўным прыхільнікам дыстанцыянаваньня ад Крамля. Мо акурат з тае прычыны, што надта добра ведаў ягоныя норавы. Як хітры дыплямат, ён лявіраваў у бочцы СНД, але ўсё больш заблытваў сытуацыю. Найперш у пытаньнях мяцежных аўтаноміяў, што трымаюцца на расейскіх штыхах, прабдеме Чачэніі, зьнітаванай з Грузіяй ня толькі межамі, але й генэтычным паходжаньнем, і адносінах з Захадам, дзе Шэварднадзэ да апошняга меў неабмежаваны крэдыт даверу.

Лёс быць у Азіі мае й свае выдаткі. Найперш гэта тычыцца вартасьці правоў асобы, што традыцыйна ня ёсьць тут першаснай каштоўнасьцю. Для грузінаў вялікае значэньне мае статус роду, клану, зямляцтва, кунацтва, дыялекту, гаворкі й г.д. — усяго, чым жыве іхняя горная краіна. У такім клімаце пераўзбудзіць народ куды прасьцей, чым у нас. Траціна тэрыторыі, занятая этнічнымі чужакамі, — падстава для згуртаваньня больш чым дастатковая.

Грузія за апошнія 15 гадоў бачыла і крывавыя міжэтнічныя канфлікты, і грамадзянскую вайну, і таямнічае забойства першага прэзыдэнта. Тысячы людзей загінулі, трыста тысячаў сталі выгнанцамі. Панішчаная й разрабаваная некалі квітнеючая гаспадарка. Вобраз гэтае краіны цяпер трывала асацыюецца ў сьвеце зь нестабільнасьцю й гвалтам. Тое, чаго ня здарылася з Грузіяй падчас другой сусьветнай вайны, здарылася на сумежжы нашых стагодзьдзяў. Ад душы цешуся за грузінаў, за сваіх колішніх калегаў і прыяцеляў. Цешуся, што гэтым разам абышлося без крыві. На жаль, такі сымпатычны гепі-энд гэткай ахайнай палітычнай гульні немагчымы ў нас. Зрэшты, і гэткую гульню мы ўжо прайгралі.

Увосень 1996 г. у Беларусі складалася сытуацыя, падобная да цяперашняй грузінскай. Лукашэнка не задавальняў ні палітычныя эліты, ні «вуліцу». Перад пагрозаю поўнае ўзурпацыі ўлады парлямэнт пачаў кардыячыцца, а людзі ішлі да Вярхоўнага Савету: «Дзядзька Сымон, мы з табой!» Як залатое восеньскае лісьце, у рукі апазыцыі самі сабою клаліся карты. Масква ўсё ўспрыняла ўсур'ёз. Як цяпер Іваноў у Тбілісі, тады ў Менск паляцела цэлая брыгада. Прычым куды больш прадстаўнічая: Чарнамырдзін, Селязьнёў да Строеў. То бок, Беларусь і тады выглядала як найважнейшы аб'ект расейскае палітыкі. Пасярэднікі па выкліку адразу зарыентаваліся, хто іхны кліент. Шарэцкі папрасіў народ разысьціся. Крамлёўскія эмісары ўгаварылі кіраўніцтва ВС і Канстытуцыйнага суду ў неабходнасьці замірэньня з Лукашэнкам. Імпічмэнт быў правалены, а разам зь ім — і шанец на натуральнае разьвіцьцё беларускай дзяржаўнасьці. Дзіўна было б чакаць ад абаронцаў Вярхоўнага Савету, што яны будуць бараніць яго насуперак волі сьпікера. Шарэцкі не сыграў тае ролі, што праз столькі гадоў выпала кіраўнічцы грузінскага парлямэнту Ніно Буржанадзэ.

Гісторыя, насуперак трапным афарызмам, не паўтараецца ніколі. Беларусь згубіла свае казырныя карты на доўгія гады: былі страчаныя і давер нацыі да палітычнай эліты, і вера ў магчымасьць вырашэньня палітычных пытаньняў сваімі рукамі. Нагадаю, тады яшчэ не было гаворкі аб прамой дапамозе апазыцыі з Захаду.

Параўноўваць сытуацыю літаральна не выпадае зусім. Ну хіба падобная элегантная й упэўненая грузінская лідэрка, што вольна гаворыць па-ангельску, да Шарэцкага? Зрэшты, сёньня й ён, бадай, вывучыў колькі сказаў. Усё ж даўно ў Клўлендзе жыве. Бальшыня ж беларускіх палітыкаў у цяперашнім парлямэнце й па-беларуску гаварыць ня ўмеюць.

А да каго зь беларускіх жанчынаўпалітыкаў можа быць падобнай Бурджанадзэ? Пытаньне, на жаль, рытарычнае. А да каго з нашых палітыкаў падобны 35-гадовы Міхаіл Саакашвілі? Дастаткова сьпелы, каб прымаць адказнасьць, і дастаткова малады, каб мець здаровы імпэт. Ягоныя раўналеткі ў Беларусі наагул ня выявілі сябе ў гісторыі. Тыя, хто чаруе ў вулічных тусоўках, — маладзейшыя, а тыя, «каму за сорак», увесь час некуды зьнікаюць.

Хіба ж можна параўноўваць з Лукашэнкам Эдуарда Шэварднадзэ, «сівога ліса», лоўкага й удачлівага дыплямата, які некалі вырашаў лёс сусьветнае гісторыі, асабіста сябраваў з Бэйкерам і Геншэрам? Уявіць сабе, што прэзыдэнт Грузіі ўскочыць з-за стала ў Кранмантана й будзе на ўсіх абзываць, як у дзіцячым садку… нерэальна. За Шэварднадзэ ў Грузіі адбылося замірэньне з аўтаноміямі, настаў хай кепскі мір замест добрай братазабойчай вайны. Не зьбівалі тут у кроў апазыцыянэраў, не зачынялі газэтаў. Дзейнічала незалежнае і архікрытычнае да Шэварднадзэ тэлебачаньне. Якое цяпер ганарыцца тым, што гэта яно ўзьняло народ на пратэст супраць фальсыфікацыі выбараў.

Урэшце, сам факт права сабраўца на цэнтральным праспэкце сталіцы дзясяткаў тысячаў апазыцыянэраў ня выклікаў тут сумневу. Ніхто не вінаваціць былога прэзыдэнта Грузіі ў раскрадаваньні грошай. Ніхто, прынамсі пакуль, не пагражае яму помстаю за нацыянальную ганьбу. І ён сышоў годна. Перагарнуў апошнюю старонку палітычнае біяграфіі дзейчоў брэжнеўскага прызыву. І з гонарам сказаў, што пампэ толькі на радзіме. Сказаў гэта ў рэзыдэнцыі патрыярха Грузінскае царквы. Добры густ.

Зрэшты, і віла ў Бадэн-Бадэне — сьведчаньне добрага густу. Не Масква ўсё ж. І не Амэрыка.

**Сяргей Харэўскі**

# Прэзыдэнтка ў заходнім стылі

Трэба мець не абы-якую волю, каб сярод хаосу надзвычайнага становішча сказаць: «Я бяру на сябе адказнасьць за кіраваньне краінай». Ніно Бурджанадзэ ня выдала хваляваньня ніводным хібным жэстам.

На гэтую высокую элегантную брунэтку, адукаваную, што абвясьціла сябе выканаўцай абавязкаў прэзыдэнта Грузіі, у суботу ўвечары заглядаўся ўвесь сьвет.

Яна некалі была саюзьніцай прэзыдэнта Шэварднадзэ, ад якога, аднак, паступова аддалілася. Высокія палітычныя сфэры для яе ня «тэра інкогніта»: бацька спн.Ніно быў чалавекам багатым і ўплывовым яшчэ за савецкім часам. Сёньня Анзор Бурджанадзэ — адзін з «бавоўняных каралёў» Грузіі. Ён фундаваў і апошнюю кампанію шэварднадзэўскага блёку.

Дачку Анзор назваў у гонар сьвятой Ніно, якая, паводле паданьня, у 337 г. н.э. прыйшла ў Грузію з Кападокіі, несучы крыж, зьвіты зь вінаграднае лазы, і хрысьціла грузінаў. Ніно ж Бурджанадзэ заставалася нехрышчонай да дваццаці гадоў.

Набліжаная пані Бурджанадзэ да дзяржаўных справаў і праз шлюб: яна замужам за першым намесьнікам генпракурора Бадры Біцадзэ, які некалькі дзён таму падаў у адстаўку ў знак пратэсту супраць дзеяньняў Шэварднадзэ. Ніно — юрыстка, скончыла МДУ. Яны з Бадры маюць двух сыноў — Анзора (17 гадоў) і Рэзіко (9 гадоў). Малодшага прывозяць да мамы ў парлямэнт з ахоўнікам.

В.а. прэзыдэнта 39 гадоў. У палітыку ўвайшла з рукі Эдуарда Шэварднадзэ — як і яе хаўрусьнік па апазыцыі харызматычны радыкал Міхаіл Саакашвілі. У 1995 г. спн.Ніно абралі ў парлямэнт, неўзабаве яна ўступіла ў праўрадавае ўтварэньне — Грузінскі грамадзянскі саюз і ўзначаліла парлямэнцкую камісію па замежных справах. У 1999 г. яна разам з Адрыянам Сэвэрынам у складзе «пяцёркі» АБСЭ наведвала Беларусь. «Гаварылі мы зь ёй выключна па-ангельску», — адзначаюць беларускія ўдзельнікі перамоваў.

У лістападзе 2001 г. Бурджанадзэ стала старшынькай парлямэнту — другой асобай у дзяржаве. Тады й пачалося разыходжаньне з Шэварднадзэ. Спн.Ніно крытыкавала ягоную палітыку, «пазбаўленую духу разьвіцьця». Некаторыя апазыцыянэры, аднак, працягвалі сумнявацца ў яе пераўвасабленьні, лічылі па-ранейшаму зьвязанай з Шэварднадзэ.

Шэсьць месяцаў таму яна дэманстратыўна пакінула пасяджэньне ўраду, на якім прэзыдэнт крытыкаваў парлямэнт за затрымкі ў прыняцьці законаў. Гэты інцыдэнт пазначаў канчатковы разрыў зь Лісам.

Перад апошнімі парлямэнцкімі выбарамі спн.Ніно ўтварыла ўласны блёк «Бурджанадзэ — дэмакраты», сумесна з сваім папярэднікам на пасадзе сьпікера Зурабам Жванія. У стане апазыцыі займае памяркоўную, у параўнаньні з гарачым Саакашвілі, пазыцыю. Але ў якасьці «в.а.» ужо дабілася адстаўкі міністраў унутраных і міжнародных справаў ды фінансаў.

**СП**

# Двоеўладзьдзе ў СНД

## Малдаўскі правал, літоўскі скандал, грузінскі абвал, украінскі нафтаправод, беларускі пазл: расейскія ўплывы ў СНД слабеюць, ЗША напагатове

Грузія для расейцаў — што для ангельцаў Індыя. Гэта мэнтальны «ўсход», толькі што разьмешчаны на поўдні. Гэта «на холмах Грузии лежит ночная мгла». Гэта Мцыры, Міміно, Кікабідзэ, Гвэрдцытэлі і Сасо Паўляшвілі. Чыбурданадзэ й Гапрындашвілі. Радзіма Прымакова й Іванова. Баграціён. Сталін і Маякоўскі. Доўгі вечар у Гаграх. І «Суліко». Там, дзе ўсё мусіць быць прасякнута любоўю да расейскіх братоў, раптам перамагае Саакашвілі. Гамсахурдзія быў сьпісаны на памылку маладосьці — і вось ізноў нацыяналіст.

Пуцін разьвітаўся з Шэварднадзэ раздражнёнай заявай: ва ўнутранай палітыцы пры ім было «толькі бездапаможнае лявіраваньне між рознымі палітычнымі сіламі краіны», а «эканамічная палітыка зьвялася да барацьбы за зьневажальныя падачкі з-за мяжы». Тон нагадвае 70-я гады мінулага стагодзьдзя і ня можа выклікаць энтузіязм у кіраўнікоў іншых падобных краінак СНД.

За што нас гэтак ня любяць? На гэтае сакрамэнтальнае пытаньне расейскае інтэлігенцыі просты прэзыдэнт якое-небудзь богам забытае Малдовы мог бы адказаць: і за такія вось разьвітаньні ў тым ліку.


PHOTO.BYMEDIA.NET
І.Іваноў і Э.Шэварднадзэ

### Ці можа Малдова абыграць Расею

У Масквы лёгкая гістэрыка дзеля непрыемнасьцяў на замежнапалітычным фронце, якія працягваюцца адна за другой, ды яшчэ ў перадвыбарчую пару, а таксама ў перыяд фэнамэнальнага нафтавага дабрабыту краіны. Ня толькі ў Грузіі, але і ў Малдове. Дзьмітры Козак, намесьнік кіраўніка адміністрацыі Пуціна, абвінаваціў Кішынэў у зрыве перамоўнага працэсу.

Візыт Пуціна ў Кішынэў сарваўся ў апошнюю хвіліну, ранкам у аўторак. Пуцін меўся прывезьці ў Малдову Мэмарандум пра асноўныя прынцыпы дзяржаўнага ўладкаваньня краіны. Ён быў папярэдне ўхвалены, але выклікаў непакой малдаўскага ўраду і пратэсты апазыцыі з Хрысьціянска-дэмакратычнага народнага фронту і «Нашай Малдовы». Бо дамова, вынашаная Яўгенам Прымаковым, прадугледжвала фэдэралізацыю краіны і 30-гадовую прысутнасьць расейскага кантынгенту. Фактычна, новая канстытуцыя давала б Прыднястроўю і Гагаузіі, г.зн. Маскве, права вэта на любыя рашэньні малдоўскага ўраду. Што немалаважна, камуністычны ўрад Вароніна ў сваім неспакоі знайшоў падтрымку Брусэлю й Вашынгтону.


AFP
Прэзыдэнт Малдовы Ўладзімер Воронін

### Чаму з Адэсы да Бродаў далей, чым з Бродаў да Адэсы

Калі ў беларуска-ўкраінскіх адносінах апошні месяц быў адзначаны інтэнсіфікацыяй кантактаў, у расейска-ўкраінскіх адносінах ён прайшоў пад знакам вялікае тузаніны вакол малое Тузлы. Тым часам украінскія ўрадоўцы і экспэрты займаліся ў зацішку кабінэтаў справай, якая можа мець доўгатэрміновыя палітычныя наступствы. Гэта пытаньне, у які бок пацячэ нафта па трубе Адэса—Броды.

На 26 лістапада было заплянаванае падпісаньне міжнароднай польска-ўкраінскай угоды аб эксплюатацыі гэтага нафтаправоду і ягонага працягу да польскага Плоцку. Цырымонія мусіла адбыцца ў Брусэлі. Дамова прадугледжвае пункт аб тым, што «ўрады абавязуюцца забясьпечыць вольны транзыт каўкаскае нафты новым трубаправодам». Гэтак супала, што Кучма напярэдадні падзеі лёг на апэрацыю.

Пад лобігам Расеі ў Кіеве меркаваньні аб спосабе выкарыстаньня трубы падзяліліся. Правацэнтрысты выступаюць за тое, каб па трубе, як і праектавалася, паплыла нафта з Казахстану. Эўразьвяз і ЗША падтрымліваюць гэткае вырашэньне. Нямеччына падраджаецца дабудаваць 90 км трубы, каб зьвязаць будучы калектар з акіянскім тэрміналам у Вільгельмсгавэне, адкуль нафту танкерамі можна вазіць хоць і ў Амэрыку.

Але левыя ва Ўкраіне схіляюцца да ідэі выкарыстаньня трубы ў якасьці чарговага шляху для экспарту расейскай нафты праз Адэсу, без дабудовы працягу да Польшчы.

Канчатковае рашэньне кіеўскі ўрад прыме да 15 студзеня. Калі яно будзе пазытыўным для Расеі, Польшча напэўна ня пойдзе на абмен граматамі аб зацьвярджэньні дамовы.


AP
Леанід Кучма

Пры ўсёй сваёй цяперашняй «смиренности» пуцінская Расея сьлепа процідзее праектам кшталту Адэса—Броды, бачачы ў іх пагрозу сваёй нафтавай манаполіі.

### Трэці прыбалтыйскі фронт

Усё больш знакаў таго, што адстаўкай прэзыдэнта Літвы скончыцца «паксасгейт». Аднак Літва не застрахаваная ад таго, што гэты папуліст паўторна вылучыць сваю кандыдатуру на абвешчаных выбарах і выйграе. Паводле вынікаў сацыялягічных апытаньняў, большасьць літоўцаў дагэтуль давярае яму, а абвінавачаньні ў сувязях з мафіяй мае за нішто. Усходняя Эўропа жыве ўласнымі, часта савецкімі мэнтальнымі правіламі. Расейскі капітал, а сьледам за ім і дыпламатыя выкарыстоўваюць гэта, але зь пераменлівым посьпехам. Аднак, паколькі Масква найчасьцей робіць стаўку на паддыванавыя камбінацыі і недэмакратычныя элемэнты ў палітычных сыстэмах, гэтыя посьпехі робіцца пераменлівым усё часьцей.

**Мікола Бугай**

# Рэвалюцыя ружаў

**Кульмінацыйным момантам грузінскай «ружавай рэвалюцыі» быў суботні штурм тысячамі прыхільнікаў апазыцыі гмаху парлямэнту на галоўнай вуліцы гораду — алеі Руставэлі.**


PHOTO.BYMEDIA.NET

Якраз у гэтым месцы адбываліся ўсе найважнейшыя падзеі найноўшай гісторыі Грузіі. Увесну 1989 г. менавіта тут зьбіраліся студэнты, якія дамагаліся незалежнасьці краіны, і тут іх мірнае шэсьце было крывава расстралянае расейскімі войскамі. Узімку 1991 г. на алеі Руставэлі разыгралася вулічная вайна, у выніку якой быў абвешчаны першы прэзыдэнт незалежнай Грузіі Зьвіяд Гамсахурдзія. Суботнім вечарам 22 лістапада, напярэдадні дня сьвятога Георгія, заступніка Грузіі, штурм парлямэнту распачалі прыхільнікі грузінскай апазыцыі, якія на працягу трох тыдняў пратэставалі супраць фальсыфікацыі парлямэнцкіх выбараў 2 лістапада. Лідэр апазыцыі Міхаіл Саакашвілі заявіў, што не дапусьціць перадачы функцый новаму парлямэнту і абраньня яго старшыні.

Увечары на заклік Саакашвілі шматтысячны натоўп, што сабраўся ля ратушы, скандуючы «Сыходзь!», рушыў да разьмешчанага за некалькі сотняў мэтраў будынку парлямэнту. Прэзыдэнт Шэварднадзэ ў гэты час выступаў з прамовай на адкрыцьці пасяджэньня новага дэпутацкага корпусу, выбранага шляхам фальсыфікацыі выбараў, што прызналі нават многія ўрадавыя назіральнікі. Салдаты і паліцыянты, якія атачалі ўрадавыя будынкі, прапусьцілі дэманстрантаў, што сьціскалі ў руках галінкі ружаў на знак таго, што яны ня хочуць гвалту.

Саакашвілі на чале некалькіх дзясяткаў дзеячоў, якія несьлі партыйныя белыя сьцягі з чырвоным крыжам сьвятога Георгія, уварваліся ў залю парлямэнту, высадзіўшы дзьверы. Яны скандавалі праз мэгафон: «Узурпатары!» Напалоханы Шэварднадзэ спрабаваў яшчэ працягваць прамову, але праз хвіліну спыніўся, а ягоныя целаахоўнікі, хапаючы прэзыдэнта пад пахі, літаральна вынесьлі яго з залі.

Імгненна расьсеяліся, кінуўшы мэталёвыя друкі, прыхільнікі губэрнатара Аджарыі Аслана Абашыдзэ, якія ў Тбілісі павінны былі бараніць уладу прэзыдэнта. Апазыцыя тым часам рушыла да суседняга 11-павярховага гмаху былога ЦК Кампартыі Грузіі, у якім Шэварднадзэ некалі кіраваў як сакратар і куды потым перанёс сваю прэзыдэнцкую рэзыдэнцыю. Тут кардоны войска і паліцыі таксама не затрымлівалі дэманстрантаў.

У гэты час у парлямэнце на трыбуну ўзышоў Саакашвілі, дапіў гарбату са шклянкі Шэварднадзэ і абвясьціў, што з гэтага моманту прэзыдэнтам краіны зьяўляецца Ніно Бурджанадзэ.

Армія і паліцыя ня слухаліся загадаў сівога прэзыдэнта. Уначы да занятага апазыцыяй будынку парлямэнту адзін за адным прыходзілі камандзіры сілавых структураў, каб засьведчыць сваю вернасьць новаму кіраўніцтву краіны і запэўніць, што яны ня будуць высылаць сваіх падразьдзяленьняў супраць апазыцыі.

У ноч з суботы на нядзелю ў Тбілісі прыбыў расейскі міністар замежных справаў Ігар Іваноў. А чацьвертай раніцы, пасьля начных перагавораў зь лідэрамі апазыцыі, ён выйшаў да прыхільнікаў апазыцыі, што сабраліся пад сьценамі парлямэнту, і ў сваёй яскравай прамове запэўніў, што Расея ня будзе ўмешвацца ў грузінскія спрэчкі. Для мітынгоўцаў гэта быў знак, што Масква ня будзе бараніць Шэварднадзэ.

У нядзелю ўвечары, пасьля паведамленьня аб адстаўцы Сівога Ліса, шматтысячная дэманстрацыя на алеі Руставэлі і плошчы Свабоды ператварылася ў шалёнае сьвяткаваньне. Скандуючы ў мэгафоны «Грузія!», людзі пачалі танчыць пад музыку, якая паплыла з гучнамоўцаў. Дагэтуль праз апошнія трансьлявалі выключна інструкцыі, звароты і паведамленьні з палёў бітвы за ўладу.

**ФС; паводле «Gazety Wyborczej»**

# Грузіны любяць эфэктнае



PHOTO.BYMEDIA.NET

### Шэварднадзэ-мільянэр

**Міністэрства ўнутраных справаў фэдэральнай зямлі Бадэн-Вюртэмбэрг у Нямеччыне пацьвердзіла, што Эдуард Шэварднадзэ набыў вілу на дарагім нямецкім курорце Бадэн-Бадэне.** Жылая плошча вілы складае 900 кв.м, плошча ўчастку — 3 гектары, а агульны кошт вілы — 11 мільёнаў эўра. Як паведамлялі грузінскія СМІ, сваякі экс-прэзыдэнта валодалі портам Поці, кампаніяй сотавай сувязі ды фірмамі, што імпартавалі ў краіну нафту, электрычнасьць, цыгарэты. У сераду Эдуард Шэварднадзэ забраў свае рэчы з прэзыдэнцкай канцылярыі. У часе гэтага ён таксама падпісваў свае кнігі ўсім ахвотным.

**МБ**

**Уладзімер Сіўчыкаў — літаратар, выдавец, перакладчык грузінскай паэзіі. Вучыўся ў Грузіі на філфаку. На просьбу карэспандэнта «НН» ён параўноўвае грузінскі й беларускі мэнталітэт.**

**«НН»: У нас пра грузінаў мяркуюць пераважна па гандлярах на базары...**

**У.С.:** Грузінам быць на Каўказе выгадна: гэта па-знака, што ты каўказец першага гатунку. Таму ў нас на рынку многія гандляры прыкідваюцца грузінамі.

**«НН»: У беларускім і грузінскім характарах ёсьць падобнае?**

**У.С.:** Мой сябра паэт Нугдар Каберыдзэ казаў: «Мы, грузіны, здаёмся пыхлівымі, маем прэтэнзіі, што кожны другі — князь. Але разам з тым мы вельмі сьціплы народ: каб не займаць на зямной тэрыторыі шмат месца, мы сьціснуліся, таму і атрымаліся горы-складкі». Ну, і беларусы, як вядома, вельмі сьціплы народ.

Другая ілюстрацыя — яшчэ адзін анэкдот ад Нугдара: «Карл Маркс казаў: пралетары ўсіх краін, яднайцеся. Але ён не казаў, што гэта трэба рабіць на тэрыторыі Грузіі».

**«НН»: А калі сур'ёзна?**

**У.С.:** Грузіны таксама, як і беларусы, жывуць на скрыжаваньні гістарычных шляхоў.

**«НН»: Як гэтае скрыжаваньне адбілася на грузінах?**

**У.С.:** У нашым уяўленьні грузін — цёмнавалосы чалавек. Але найбольш «чыстыя» грузіны захаваліся высока ў гарах — у Горнай Рачы, Сванэціі: сваны — рудавалосыя і блакітнавокія.

Ёсьць некалькі этнаграфічных абласьцей, якія вельмі дакладна ўсьведамляюць сваё адрозьненьне. Шэварднадзэ — мінгрэл. Ёсьць яшчэ картлійцы, кахецінцы, рачынцы, сваны... З кахецінцаў увесь час пасьмейваюцца: маўляў, «прытарможаныя». Мінгрэлы — вельмі амбітныя, любяць уладу. Сваны вельмі ганарацца, што яны самыя «чыстыя» грузіны...

**«НН»: У нас таксама ёсьць палешукі, слуцакі, палачане...**

**У.С.:** У нас гэта больш нівэлявана. У грузінаў жа ёсьць гэтае самаўсьведамленьне: мала быць грузінам — трэба быць мінгрэлам, ці кахецінцам, ці картлійцам, ці сванам... У маім літаратурным асяродку маглі падкрэсьліць: «Ён так добра гаворыць па-грузінску, бо ён картліец». А картлійскі дыялект пакладзены ў аснову грузінскай літаратурнай мовы.

**«НН»: Гэтая «ўкарэненасьць», повязь з роднай зямлёй, мусіць, адбіваецца і на памяці роду?**

**У.С.:** Тут мы грузінам прайграём. У Грузіі, у фальклёрнай экспэдыцыі, мы пазнаёміліся зь дзедам, які стаў распытваць дзяўчат, якія ў іх прозьвішчы ды зь якіх яны родаў. Адна кажа: «Маё прозьвішча Кіладзэ». Дзед пацокаў языком: «Добры старадаўні род».

> Сапраўдныя грузіны — рудавалосыя і блакітнавокія

**«НН»: Гэта агульнае стаўленьне да родавай гісторыі?**

**У.С.:** Грузіны ганарацца сваім родам. Кажа хто-небудзь: «Я з старога роду, маё прозьвішча Давіташвілі. Дато — азначае «мядзьведзь», швілі — дзіця. Я з княскага роду». А хто ж тады былі сяляне, калі кожны другі — князь?

**«НН»: Калі пачаліся беларуска-грузінскія повязі?**

**У.С.:** Беларусы згадваюць пра грузінаў недзе ў XIV ст. — у «Хаджэньні ў Царград» Ігнація Смаляніна. На грузінскую мову даволі рана былі перакладзеныя творы Кірылы Тураўскага і Сімяона Полацкага.

**«НН»: Прыкладна калі?**

**У.С.:** Ад часу напісаньня нарэшце яшчэ гадоў 50—100 — і атрымаеце прыблізную дату. Але ж першыя ўласныя грузінскія пісьмовыя помнікі — гэта V ст., як мінімум на паўтысячагодзьдзя раней за нас.

**«НН»: Дык тое, што першым прэзыдэнтам у іх стаў перакладчык Зьвіяд Гамсахурдзія, сын і ўнук пісьменьнікаў, гістарычна абумоўлена?**

**У.С.:** У Грузіі шануюць адукаваных людзей. У фальклёрнай экспэдыцыі ў Горнай Рачы мы размаўляліся з грузінскім дзедам на адным зь вінаграднікаў. Ён цытаваў вялізнымі разьдзеламі вершы Важы Пшавэлы, руставэліеўскага «Віцязя ў барсавай скуры». Калі б таго дзеда не спыніць, ён мог бы цытаваць і паўгадзіны, і гадзіну.

Гэта прыклад таго, як колькасьць пераходзіць у якасьць: нездарма ж у грузінаў такія даўнія пераклады Бібліі. У іх у XX ст. не было такога таптаньня традыцыі, як у нас. Тэнгіз Абуладзэ зьняў у перабудову магутны фільм «Пакаяньне». У нас ёсьць магутная публіцыстыка Адамовіча, але ці маем мы такі фільм?..

**«НН»: Грузіны традыцыйна падаюцца імпульсіўнай нацыяй...**

**У.С.:** Для грузінаў важна зрабіць эфэкт. Маўляў, я князь, для гасьцей аддам апошняе... Калі мы прыходзілі на вясельлі, там зь вялікім гонарам казалі: «Вось тут у нас ёсьць сябры, якія вывучаюць нашую мову: гэта — з Амэрыкі, гэта — з Славеніі, гэта — з Малдавіі, гэта — зь Беларусі»... Гэтым паказвалі: нас любяць, намі цікавяцца.

**«НН»: Які досьвед мы маглі б пераняць у Грузіі?**

**У.С.:** Вельмі важна мець волю да перамогі. За сваю перамогу грузіны заплацілі крывёю: прыгадайце сапёрныя рыдлёўкі ў 1989 г. А яшчэ ў 1986 г. мае грузінскія сябры казалі мне: «Валодзя, будзем мы незалежныя, будзеце вы незалежныя — прыедзеш да нас пасьлом». Неяк Арлоў у адным з інтэрвію сказаў, што быў бы ўсьцешаны, каб у нас наступным прэзыдэнтам стала жанчына. Што й калі будзе ў нас — невядома. А ў Грузіі да ўлады, падобна, прыходзіць жанчына.

**Размаўлялі Аркадзь Шанскі, Вераніка Дзядок**

### Ішоў бы па праспэкце Руставэлі...

Грузінскія карані мае кінарэжысэр (ня блытаць зь пісьменьнікам) **Уладзімер Арлоў**. Ягоны дзед быў міністрам фінансаў Закаўказьзя. Радзіма Шэварднадзэ знаходзіцца за 7 км ад сяла Чабаты, дзе жывуць сваякі Арлова. Апошні абураецца паводзінамі Шэварднадзэ: «Калі б ён пайшоў у адстаўку сам, хоць на дзень раней, быў бы шанаваным чалавекам. Ішоў бы па праспэкце Руставэлі, дык яго б усе ў дом запрашалі, частавалі. Дык не — трэ было дачакацца, калі яго выставілі. Мне шкада гэтага чалавека: ён здолеў зьнішчыць Бэрлінскі мур, але ня здолеў своечасова сысьці».

Кампазытар **Андрэй Мдзівані** ацэньвае падзеі адмовіўся: кажа, 50 гадоў ня быў.

## ХРОНІКА

### Тбілісі шукае фальсыфікатараў...

**В.а. прэзыдэнта Грузіі Ніно Бурджанадзэ заявіла ў жывым этэры ТВ, што ў сувязі з фальшаваньнем вынікаў выбараў узбуджаная крымінальная справа.** «Усе вінаватыя павінны быць пакараныя, якія б вялікія ці малыя пасады яны ні займалі. Хтосьці ў гэтай краіне раз і назаўжды мусіць быць пакараны за дзеяньні проці закону і народу», — зазначыла Бурджанадзэ.

### ...Масква шыкуе альянс

**Лідэры Паўднёвай Асетыі і Аджарыі — крайн, што спрабуюць аддзяліцца ад Грузіі, — сустрэліся ў аўторак у Маскве.** Туды ж прыбывае прэм'ер Абхазіі. У Тбілісі такую гасьцінасьць суседняй дзяржавы лічаць несяброўскай.

### Правацэнтрысты яднаюцца

**Міхаіл Саакашвілі стане кандыдатам на пасаду прэзыдэнта Грузіі ад правацэнтрысцкіх партый,** а Ніно Бурджанадзэ, напэўна, узначаліць адзіны сьпіс партый «Нацыянальны рух» і «Бурджанадзэ — дэмакраты» на парлямэнцкіх выбарах.

**МБ**

# Ня так фальсыфікацыі, як безуладзьдзе

Праз 12 гадоў пасьля распаду СССР у Грузіі спынілася прамысловасьць і, як вынік, нашмат палепшылася экалёгія. Грузіны даўно ня маюць цэнтральнага ацяпленьня, у многіх дамах няма электрычнасьці. Людзі жывуць аўтаномна, і кожны адказвае сам за сябе. У Грузіі вельмі дрэнныя дарогі. Беларуская ў параўнаньні зь імі — люстэрка. Грузіны ня плацяць ніякіх падаткаў, таму іх папросту не зьбіраюць. З гэтай прычыны вельмі дрэнна ўладкаваны сацыяльныя і камунальныя справы. Дамы звонку выглядаюць абшарпанымі, але ў кватэрах усё прыстойна і нават шыкоўна. Гэтак у гутарцы з карэспандэнтам «НН» характарызуе грузінскае жыцьцё Сьвятлана Каралёва, якая ў 1995—98 г. працавала каардынатарам Эўрапейскага міжнароднага форуму па краінах былога СНД і часта наведвала Грузію.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Яшчэ ў верасьні ў краіне не было ані знаку, што сытуацыя так радыкальна зьменіцца, кажа спн.Каралёва. Ішла спакойная падрыхтоўка да выбараў, толькі пачыналася агітацыйная кампанія, можна было пабачыць першыя рэклямныя плякаты дэмакратычнага блёку і партыі Шэварднадзэ.

Грузінскае грамадзтва вельмі палітызаванае яшчэ з часу вайны. Там ніхто не баіцца выказваць сваё меркаваньне пра Шэварднадзэ, пазытыўнае альбо нэгатыўнае. Там кожны чалавек мае гэта меркаваньне і выказвае яго публічна.

Неразьвітасьць дзяржаўніцкага ўладкаваньня стала адной з прычынаў скандалу на выбарах. Праблемы былі нават не з фальсыфікацыямі, а з арганізацыяй выбарчых участкаў, як зазначала АБСЭ. Шмат у якіх вёсках участкі проста не былі падрыхтаваныя — дзяржаўная ўлада датуль не даходзіць. А каб уехаць у Аджарыю з тэрыторыі Грузіі, патрэбна паказваць пашпарт.

У краіне амаль не выплачваецца сацыяльных дапамогаў. Менавіта таму ўсе грузіны ўпэўненыя, што ў Беларусі жывецца вельмі добра. Кожны грузін сьцьвярджае, што альбо служыў у войску, альбо працаваў у Беларусі, альбо мае там сваякоў. Яны ўвогуле вельмі любяць беларусаў. Ужо пры знаёмстве тое, што ты беларус, гэта лішні плюс для цябе.

Жанчыны ў палітыцы — ня толькі Ніно Бурджанадзэ, ва ўрадзе ёсьць яшчэ жанчына — міністарка экалёгіі, вельмі моцны палітык, якая ўжо гадоў сем займае гэту пасаду і мае вялікую папулярнасьць. У Грузіі ўвогуле вельмі моцны жаночы пачатак. Там у сем'ях поўны матрыярхат, жанчына — галава, у доме ўсё залежыць ад жынчыны. Тое ж у прыватных кавярнях і гатэлях, дзе жанчыны — гаспадыні. Можа быць, таму, што шмат мужчынаў пазьяжджала.

**Вераніка Дзядок**

# Урокі

**«Калі беларускія ўлады будуць і далей недэмакратычна ставіцца да выбарчага працэсу, у апазыцыйных сілаў ня будзе іншага выйсьця, апроч як выкарыстоўваць грузінскі сцэнар», — такую думку выказала старшыня Беларускага Хельсынскага камітэту Тацяна Працька па сьвежых сьлядах грузінскіх падзей. Якую навуку вынесе Беларусь з грузінскае куламесы? Для адказу на гэтае пытаньне «НН» сабрала ў Рэдакцыі на «круглы стол» беларускіх палітыкаў. На жаль, ніхто з прадстаўнікоў «партыі ўлады» на запрашэньне не адгукнуўся.**
**У «круглым стале» ўзялі ўдзел дэпутаты палаты прадстаўнікоў Уладзімер Парфяновіч і Валеры Фралоў, сябра Сойму Партыі БНФ Вацлаў Арэшка, кіраўнікі незарэгістраваных моладзевых арганізацый «Малады фронт» і «Зубр» Павал Севярынец і Ўладзімер Кабец, старшыня аб'яднаньня прадпрымальнікаў «Пэрспэктыва» Анатоль Шумчанка, адзін ль лідэраў Эўракааліцыі «Свабодная Беларусь» Зьміцер Бандарэнка і першы сакратар ЦК ЛКСМБ Дзьмітры Яненка. Вёў круглы стол галоўны рэдактар «НН» Андрэй Дынько.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Валеры Фралоў: «Трэба трэніравацца, каб нанесьці галоўны ўдар у патрэбны час, у патрэбным месцы і па самым слабым зьвяне». На заднім пляне — Уладзімер Парфяновіч.**

**А.Дынько**: Наіўна думаць, што ў Беларусі могуць паўтарыцца грузінскія падзеі. Дастаткова паставіць побач Ніно Бурджанадзэ і Сямёна Шарэцкага, каб зразумець, чаму не адбылося гэта ў 1996 г. Дастаткова параўнаць Шэварднадзэ і Лукашэнку, каб зразумець, што Грузія — не Беларусь... Але кожная такая падзея адбіваецца рэхам у розумах людзей, вучыць палітыкаў. Чым вас найбольш уразілі грузінскія падзеі?

**У.Парфяновіч**: Грузія можа стаць меншай краінай, чымся ёсьць цяпер. Калі адлучыцца Аджарыя. Хацелася б, каб усё праходзіла ў Грузіі цывілізавана, каб яна стала дэмакратычнай краінай, якую не разьдзіралі б унутраныя канфлікты.

Грузія паказала, як апазыцыйныя партыі аб'ядналіся і правялі т.зв. «аксамітную рэвалюцыю». Хацелася б, каб і ў Беларусі адбылося такое аб'яднаньне, каб, незалежна ад палітычных поглядаў, аб'ядналіся ўсе, хто за незалежнасьць і дэмакратыю.

## Схема працуе

**З.Бандарэнка**: Я ня згодны з тым, што грузінскі сцэнар немагчымы ў Беларусі. Гэта тое самае, што казаць, нібыта ў нас, у адрозьненьне ад Грузіі, ня дзейнічаюць законы фізыкі. Падзеі ў Грузіі падобныя да падзей у Сэрбіі. Схема працуе. Адзін з прынцыпаў — калі выбары сфальсыфікаваныя і народ адчувае сябе падманутым, справядлівасьць трэба абараняць. Трэба ісьці на рызыку, каб праўда перамагла. Прычым рэвалюцыя ня робіцца на наступны дзень — трэба стаяць дзень, тыдзень. Ня так, як пастаялі 9 верасьня 2001-га і разышліся.

**В.Фралоў**: Нешта падобнае можа адбыцца ў Беларусі. Мы езьдзім па краіне і бачым, што вельмі многія людзі разумеюць: краіна нікуды ня рухаецца. І пашырэньне кола гэтых людзей можа прывесьці да падзеяў, падобных да грузінскіх.



**Дзьмітры Яненка**

Мне, як вайскоўцу, спадабалася пазыцыя сілавікоў у Грузіі. Іх неўмяшальніцтва прывяло да адсутнасьці крыві. Яны зразумелі сытуацыю і паявілі сябе годна.

**А.Шумчанка:** Калі ня будзе зьменаў у галіне кіраваньня краінай, гэта самае адбудзецца і ў Беларусі. Гэта можа быць праз пяць, можа быць праз дзесяць гадоў, але будзе.

**У.Кабец**: Тое, што не ўдалося зрабіць у Беларусі ў 2001 г., удалося ў Грузіі, паводле таго самага сцэнару. Аб'яднаныя людзі не збаяліся ні войскаў, ні захадаў уладаў і іх пагрозаў. Налета ў нас выбары. І мы ня хочам атрымаць «рэмікс» тых падзеяў, якія ў нас адбыліся ў 2001 г. І ў Сэрбіі, і ў Грузіі пратэсты пачаліся не адразу, яны рыхтаваліся некалькі тыдняў. Шмат працавалі маладыя людзі з арганізацыі «Кмара». Запомнілася, што ў вачах лідэраў грузінскай апазыцыі не было страху — ён быў у вачах Шэварднадзэ.

Сёньня мы маем два апазыцыйныя цэнтры, якія павінны аб'яднацца, каб мы атрымалі ў наступным годзе нашу «рэвалюцыю ружаў».

**П.Севярынец**: Грузія была ўсё ж у лепшым становішчы. Там былі два цэнтры ўплыву, якія паміж сабою дужаліся, — ЗША і Расея. У вырашальную ноч Паўэл сказаў, што ўсё павінна быць паводле канстытуцыі. Сытуацыя ў Беларусі істотна іншая. Расея да нядаўняга часу кантралявала інфармацыйную прастору, а цяпер можа стварыць у любым пункце Беларусі той ціск, якому супрацьстаяць Лукашэнка ня зможа. Супрацьстаяць можа толькі беларускі народ, калі ён разам зьбярэцца.

З другога боку, у Грузіі значна горшае эканамічнае становішча. Сьвятло ёсьць толькі ў Тбілісі. Пратэставыя настроі там былі больш выразныя. У Беларусі мы назіраем пратэставыя настроі 60—70%, але рэйтынг усёй апазыцыі застаецца ў межах 20%. Рэальных справаў няма. Няма жаданьня, самае галоўнае — няма волі выкарыстаць гэта ўсё. Я не магу сабе ўявіць Вячорку альбо Бухвостава, якія ўрываюцца ў залю парлямэнту з сотняй сваіх прыхільнікаў і крычаць: «Лукашэнку ў адстаўку!» Але людзі такія ў асяродку апазыцыі ёсьць. І яны своечасова выявяцца, я пэўны.

Трэба аддаць належнае Шэварднадзэ. Сысьці так, як зрабіў ён, для Лукашэнкі будзе псыхалягічна вельмі цяжка. Любая ўлада, дыктатура ўвесь час чакае, калі ў апазыцыі здадуць нэрвы. Калі людзі расчаруюцца, разыдуцца. Перамагчы можна толькі воляю і вераю, якія маюць першаснае значэньне.

**В.Арэшка:** Грузія падобная да Беларусі тым, што кааліцыя там стварылася толькі пад сумесную перамогу, пад разавую акцыю, на якой лёгка сканцэнтравацца. А што іх чакае ва ўрадзе — гэта ўжо іншае пытаньне. Ёсьць праблемы Абхазіі, Аджарыі, іншыя праблемы, якіх ня вырашыў Шэварднадзэ, — тое ж энэргазабесьпячэньне. Заўтра прыйдуць людзі і скажуць — заплаці нам заробак. А плаціць няма чым. Ніякая заходняя дапамога ня зможа вырашыць грузінскіх праблемаў. Расея ж можа і прапанаваць танныя энэрганосьбіты, і выкарыстаць рычагі ўплыву. Нездарма ж прыскакаў адразу Іваноў.

Беларускія мэдыі стрымана камэнтавалі сытуацыю. Для нашага рэжыму гэта вельмі моцны ўдар. Гэта прыклад таго, што будзе з гэтым рэжымам.

Цікава паглядзець, як новы грузінскі ўрад выкруціцца, наколькі застанецца праэўрапейскім. Шэварднадзэ пры ўсіх сваіх недахопах утрымаў Грузію ў дастатковай ступені незалежнай.

## Нашы сілавікі — нармальныя людзі

**Дз.Яненка**: Мяне ўразіла хуткасьць, зь якой скончыліся грузінскія падзеі. Я думаў, Шэварднадзэ будзе марудзіць, гуляючы на супрацьстаяньні інтарэсаў Расеі і ЗША. У яго хапіла палітычнай сьпеласьці не аддаць войску і паліцыі загаду на ўзброенае супрацьстаяньне. Я думаў, там без крыві не абыдзецца. Каб у нас склалася такая сытуацыя, дык Лукашэнка вельмі проста аддаў бы загад разагнаць, адкрыць агонь. Я ня веру, што Лукашэнка сыдзе мірна, што ад яго адыдуць сілавікі, бо мы ведаем, як у нас прызначаюцца гэтыя людзі. На чалавека ёсьць вялізны кампрамат, з дапамогай якога можна трымаць чалавека.

**В.Фралоў:** Вы памыляецеся. Я ведаю нашых міністраў, іншых сілавікоў. Гэта ў пераважнай большасьці нармальныя людзі. І няма такога кампрамату, каб заставіць чалавека пайсьці супраць народу.

**В.Арэшка**: У сытуацыі, калі вярхі ўжо ня змогуць, а нізы не захочуць, сілавікі таксама задумаюцца.

## Як стварыць супэрклюб

**З.Бандарэнка**: Шэварднадзэ прыйшоў да ўлады на штыхах расейскага спэцназу. Давайце ўзгадаем масавыя забойствы сваіх грамадзянаў. Ён — удзельнік грамадзянскай вайны. Як і Мілошавіч. Ня трэба казаць, што Лукашэнка — монстар, а Мілошавіч і Шэварднадзэ добрыя дзядулі. Вы кажаце, што ў нас няма сваіх Саакашвілі і Бурджанадзэ? Але гэта, ведаеце, як у футболе. Калі вы хочаце стварыць супэрклюб, трэба адпаведная арганізацыйная праца, і тады будзе супэрклюб. Без тэлевізіі, без радыёстанцыі беларуская апазыцыя выводзіла дзясяткі тысячаў людзей на «Маршы свабоды». А грузіны не маглі. Тэлебачаньне «Руставі-2» заклікала, але яны тыдзень не маглі сабраць людзей. Нават у ЗША сёньня перамагае той, хто выкарыстоўвае не тэлевізію і радыё, а схему «ад дзьвярэй да дзьвярэй» і тэлефонны абзвон.

Што да тактыкі, дык я катэгарычна супраць таго, каб сьвяціць сёньня сьпіс кандыдатаў. Каб людзей за год да выбараў пачалі ціснуць. Мы павінны паказваць, што кааліцыя багатая на асобы, але хто пойдзе на выбары — павінна быць вырашана за некалькі месяцаў.

**А.Дынько**: Грузінская апазыцыя ішла на выбары рознымі калёнамі. Пры гэтым дабілася перамогі. І стала ясна, хто там меў папулярнасьць, а хто не. Але ў Грузіі прапарцыйная выбарчая сыстэма. У Беларусі ва ўмовах мажарытарнай сыстэмы і меншай дэмакратычнасьці выбараў ці не прывядзе паход на выбары рознымі калёнамі да драбненьня сілаў і аслабленьня камуляцыйнага выніку апазыцыі?

**Д.Яненка**: Дзьве створаныя кааліцыі — вялікі плюс нам. Бо ўжо сёньня апытаньні паказваюць, што за адзінага кандыдата ад апазыцыі на парлямэнцкіх выбарах гатовыя галасаваць 30% чалавек. Ім усё адно, хто гэта будзе, камуніст ці франтавец.

Калі мы пойдзем кааліцыяй, усе разам, у нас ёсьць вялікі шанец перамагчы. Калі пойдзем асобна — будзем аслабляць сябе.

## Браць колькасьцю!

**В.Фралоў**: Я вось прыглядзеўся… Калёны ж у нас ня вельмі доўгія! Няма ўменьня, досьведу, няма дастаткова людзей, якія маглі б запоўніць клеткі шахматнай дошкі 110 на 110. Таму, можа, ёсьць сэнс браць колькасьцю? Проста ісьці вялізнымі масамі. Многіх павыбіваюць: куля-мётамі пакосяць ці пасякуць... Але хтосьці пройдзе. Ёсьць небясьпека, што праз жаданьне запоўніць сьпіс туды могуць трапіць людзі, якія яго зусім не ўпрыгожаць. Проста нейкія крыкуны ці пакрыўджаныя на сьвет. Такія выбараў ня выйграюць. Але зь іншага боку, ідучы на выбары, «калёны» трэба дысцыплінаваць. Усё павінна быць ураўнаважана. Каб побач са спакойнымі, памяркоўнымі сіламі былі і больш радыкальныя.



**Павал Севярынец**

# грузінскае

**З.Бандарэнка**: Лепш, каб была адна калёна. У мяне няма ўпэўненасьці і па «пяцёрцы», што там будзе адзін сьпіс. Я не разумею, што там робяць камуністы. Выстаўце на выбары камуніста і скажыце, што ён дэмакрат… Ды ня буду я за яго галасаваць!

**Д.Яненка**: Нашая партыя ПКБ вызнае дэмакратычныя каштоўнасьці. Галоўная задача, якая аб'яднала партыі ў «пяцёрку-плюс», — супрацьдзеяньне трэцяму тэрміну. І ў гэтым мы, камуністы і фронтаўцы, — адзіныя. Калі трапім у парлямэнт і будзем разглядаць законапраекты па эканоміцы — паспрачаемся. Але ніводная партыя ня можа нармальна разьвівацца, пакуль ва ўладзе Лукашэнка.

### І вас выклічуць

**У.Парфяновіч**: Задача адна — каб у Беларусі была дэмакратыя.

**П.Севярынец**: Самы верагодны сцэнар усталяваньня дэмакратыі — гэта прыход Расеі, расейскага стаўленіка, лібэралізацыя эканомікі і продаж усяго расейскім алігархам. Вось гэта, спадарства, варыянт, на які, дарэчы, цяпер, я лічу, працуе «пяцёрка». У Маскву выклікаюць яе лідэраў і масажуюць наконт гэтага: «Хлопцы, гэта варыянт!»

**В.Арэшка**: Яны абяцаюць, што і вас выклічуць...

**П.Севярынец**: Мы яшчэ паглядзім, як адрэагаваць. Альбо прыехаць са скандалам...

**В.Арэшка**: Вы ж там грошы зарабляеце...

**П.Севярынец**: У Расеі мы робім выбары, і мы ўплываем на сытуацыю ў Расеі, а не наадварот.

### Вы чулі пра грузінскія партыі?

**А.Дынько**: У Грузіі перамагла нацыяналістычная партыя «Нацыянальны рух». Партыя ж «Бурджанадзэ — дэмакраты» набрала сьціплы працэнт галасоў. Амаль аднначасова ў Харватыі да ўлады вярнуліся нацыяналісты. Ва Ўкраіне галоўным кандыдатам ад апазыцыі на выбарах будзе правацэнтрыст Віктар Юшчанка. Ці можна гаварыць пра «другое дыханьне» нацыянальных і правацэнтрысцкіх партыяў ва Ўсходняй Эўропе?

**А.Шумчанка:** Тое, што адбылося ў Грузіі, трэба разглядаць ня з гледзішча партыйнага, але з гледзішча імёнаў. Вы чулі пра грузінскія партыі? Я чуў прозьвішчы — Саакашвілі, Бурджанадзэ. І ў нас людзі выйдуць, калі будуць два-тры нацыянальныя лідэры. Каго я бачу лідэрам? Гэта можа быць Фралоў, Колас, Лявонаў ці хто яшчэ. Людзям патрэбная рэальная альтэрнатыва. Ім трэба паказаць гэтую альтэрнатыву. Лідэраў трэба раскручваць ужо сёньня, калі мы хочам выйграць выбары.

**В.Фралоў**: Нацыянальныя партыі — гэта партыі тых людзей, якім неабыякавы лёс айчыны. Астатняя маса не кіруецца нацыянальнымі ідэямі. Але ў пэўны момант яна далучаецца да гэтых людзей, што зьяўляюцца праціўнікамі тых, хто стварыў гэты бесталковы спосаб жыцьця. Дзякуй Богу, што ў Грузіі яны знайшлі паразуменьне з дэмакратамі. І мы мусім знайсьці. Сярод тых, хто прыйдзе да ўлады, мусіць быць многа людзей зь ліку тых, хто цяпер пры ўладзе. Я таксама быў начальнікам не зусім маленькім і ведаю: вось у Гарадзенскай вобласьці маса старшыняў райвыканкамаў — папросту нармальныя людзі! Мы з Валодзем (У.Парфяновіч. — **Рэд.**) ведаем некаторых старшыняў райвыканкамаў ужо гадоў дзесяць — і на рыбалцы, і на паляваньні... Мяне што абурае ў гэтай сытуацыі — што гэты вось наш, «той хлопец», ён нас, нармальных людзей, падзяліў, зрабіў ворагамі!

Нацыянальная ідэя гасьне, гасьне, але маладыя хлопцы будуць якраз тымі, хто падліе ў напаўзгаслае вогнішча. Ня ведаю, праўда, што яны там падліюць... Таму яны і наперадзе. А астатнія вельмі ж ужо спакойныя. Думаюць, як і што, пралічваюць розныя варыянты... Трэба ісьці на разумную рызыку — тады будзе перамога. Як Напалеон у свой час рызыкаваў. Калі сапраўдных буйных мала, тады й няма правадыроў, як там сьпяваў Высоцкі.

**У.Парфяновіч**: Трэба, каб мы атрымлівалі перамогі. У маленькай справе ці вялікай. Паразы, якія былі дагэтуль, пакінулі ў людзей кепскі сьлед. Трэба ісьці па шляху маленькіх, але перамог. Гэта будзе шлях да вялікай перамогі.

**В.Фралоў**: Трэба трэніравацца, каб нанесьці галоўны ўдар у патрэбны час, у патрэбным месцы і па самым слабым зьвяне.

**В.Арэшка**: Кансалідацыйныя рэсурсы нацыянальнай ідэі не былі да канца рэалізаваныя ў Беларусі, і гэта павінна адбыцца. І «пяцёрка», і тыя, хто ня згодны з «пяцёркай», пагаджаюцца, што Беларусь павінна быць незалежнай. Незалежнасьць яднае ўсіх. Гэта той мосьцік, па якім можна перайсьці нават да боку, на якім ёсьць лукашэнкаўская адміністрацыя. Нават Лукашэнка пачаў карыстацца той рыторыкай, якой яшчэ дзесяць гадоў таму гаварыў БНФ. Нацыянальная ідэя яшчэ будзе працаваць.

**У.Кабец**: Заўважце, і Бурджанадзэ, і Саакашвілі найперш казалі пра эўрапейскі выбар Грузіі, пра інтэграцыю ў Эўразьвяз і NATO. У нашым рэгіёне сёньня адбываецца найперш эўрапейскі выбар, і гэта вельмі паказальна.

**Дз.Яненка**: Я не лічу, што ідзе тэндэнцыя «праванацыяналістычнага захопу» ў розных краінах.



Уладзімер Кабец



Зьміцер Бандарэнка

Хутчэй гэта асобныя перамогі.

**А.Дынько**: Бурджанадзэ і Жванія рабілі кампанію на грошы Захаду. Але перад выбарамі яны былі доўга ў Маскве, прабіваліся ў расейскую прэсу. У нас традыцыйна мяркуецца, што Расея ня можа падтрымаць тыя ж палітычныя сілы, якія падтрымлівае Захад. Як вы лічыце, ці пагодзіцца Расея калісьці з роляй Захаду ў Беларусі? Ці пагодзіцца з новым раскладам сілаў, што тут утвараецца?

### Трэба нам беларускіх алігархаў

**У.Парфяновіч**: Я ўжо стаў падазраваць, што заходнія краіны аддалі Беларусь на водкуп Расеі. Пачаў цікавіцца, пытацца ў кожнага заходняга пасла ў Менску: «Вы што, ня лічыце патрэбным мяняць сытуацыю ў Беларусі?» Усе ў адзіны голас сказалі, што такой дамоўленасьці з Расеяй не існуе. Што яны Беларусь «ніколі не аддавалі». Гэта радуе. З другога боку, калі будзе нейкая фінансавая дапамога, у большай ступені ў гэтым зацікаўленая Расея. І не таму, што прыйдуць нейкія расейскія алігархі і скупяць нашы прадпрыемствы. Хоць дзякуй богу, каб прыйшлі ды іх скупілі. За грошы. Каб яны працавалі. Але ці застануцца алігархі ў Расеі заўтра? І якія — прапуцінскія, прабушаўскія? Вось Мажэйкяйскі нафтаперапрацоўчы завод купілі амэрыканскія алігархі і прадалі расейскім. Рух фінансавых плыняў — складаны працэс.

**В.Фралоў:** Трэба нам беларускіх алігархаў, сваіх, каб ім прадаваць.

**У.Парфяновіч:** Пакуль нашыя грамадзяне ня будуць удзельнічаць у разьмеркаваньні прыбыткаў сваіх прадпрыемстваў, нічога мы тут не збудуем — ні з расейскімі грашыма, ні, так бы мовіць, з Антантай.

**П.Севярынец**: Наступ нацыяналізму — сусьветная тэндэнцыя. Нават у Штатах рэспубліканцы — гэта своеасаблівыя нацыяналісты. У Беларусі нацыянальныя настроі мацнеюць, абапіраючыся на канкрэтную глебу. І гэта паказвае, што мы — нармальная краіна. У Грузіі перамаглі маладыя нацыяналісты пад бел-чырвонабелымі сьцягамі, і ў нас пераможуць маладыя нацыяналісты пад бел-чырвона-белымі сьцягамі.

**З.Бандарэнка**: Саакашвілі чатыры гады вучыўся ў Амэрыцы. Ён сказаў: «Дзякуй, што нам дапамагалі амэрыканцы, дзякуй, што дапамагаюць і, я думаю, будуць дапамагаць і далей». Бурджанадзэ — празаходняя, і яе мэта — уваходжаньне ў ЭЗ. Гэта не нацыяналізм у чыстым выглядзе. Мы бачылі, што ў Польшчы мяняліся і камуністы, і правыя і ўсё роўна яна ішла ў Эўропу. І гэта парадаксальна — дайшла пры камуністах. У сэрбаў няма яшчэ такога. І ў Грузіі праблема будзе сур'ёзная, думаю.

У Сэрбіі я быў пасьля перамогі, праз год. Прабачце, хадзіць у кашулях з «Отпарам» у Бялградзе небясьпечна, цяпер «Отпару» ў Бялградзе ня любяць. Я хадзіў у кашулях з зубром. Дык нават з зубром на мітынгу ў абарону Мілошавіча яны адчувалі, што я вораг. У Сэрбіі цяпер паводле ўсіх сацыялягічных апытаньняў можа адбыцца рэванш мілошавічаўцаў.

І ў Грузіі пастка. 300 тысяч уцекачоў галасавалі за Саакашвілі. Калі ён не пачне вайны з Абхазіяй на працягу году, то пачнуцца бунты. Я думаю, Расея ўзважыла гэту сытуацыю ды прыбрала хітрага дыпламата Шэварднадзэ, асабістую антыпатыю Пуціна. А наконт Беларусі, мне здаецца, бяда ў



Вацлаў Арэшка

тым, што БНФ своечасова ня быў ператвораны ў Народную партыю. Я быў у Швайцарыі падчас выбараў, бачыў: стаяць з дудамі швайцарскімі, абсалютна правыя, чалавек уздымае сьцяг Швайцарыі, барабаншчыкі — гэта шоў, моц, нацыянальны дух. У Фронце гэта ператварылася ў эстэтыку саламяных капелюшоў. Фронт займае нацыяналістычную нішу, хаця эстэтычна, энэргетычна, арганізацыйна ён не адпавядае сучасным правым партыям. Што няма ў нас моцнай правай партыі — гэта праблема. Бо Саакашвілі — сучасны. Гэта прыгожа. Гэта эстэтыка. Ён уварваўся ў парлямэнт і ўзяў уладу.



Анатоль Шумчанка

## ГАСПАДАРКА

### Пераход у Брузгах

**У ноч зь пятніцы на суботу пачаўся рух грузавікоў на памежным пераходзе ў Кузьніцы-Беластоцкай.** Польшча ўклала ў будоўлю 55 млн даляраў, зь іх трэцюю частку дафінансаваў Эўразьвяз. Цяпер гэта самы сучасны памежны пераход. Ягоная прапускная здольнасьць — 8 тыс. аўтамабіляў і 1500 грузавікоў у дзень.

### Рэзкі рост грашовай масы

**Аб'ём грашовай масы павялічыўся за 9 месяцаў на 46,6% пры росьце цэнаў за гэты пэрыяд 18,4%.** Нажніцы росту могуць сьведчыць пра завышанасьць курсу рубля. На 1 кастрычніка аб'ём грашовай масы складаў 2,9 трлн руб. Безнаяўныя грошы ў гэтым аб'ёме складаюць 73,1%.

### Блахін пра канфіскацыі

**Расейскі пасол Аляксандар Блахін заявіў, што беларускія мытнікі канфіскуюць «з спрэчных, а то й надуманых прычынах» усё больш расейскіх транзытных грузаў, што ідуць праз Беларусь.** У 2000 г. канфіскат склаў 15 млн USD, у 2001 — 30, у 2002 — 60, за 9 месяцаў 2003-га — ужо столькі ж. Пасол лічыць гэтую сытуацыю «вусьцішнай».

### Лёгкая аўтастаянка

**У 2004 г. у Менску збудуюць першую трохузроўневую аўтастаянку зь лёгкіх мэталаканструкцыяў.** Месьціцца яна будзе на вул. Прытыцкага і зьмяшчаць 300 аўтамабіляў, а каштаваць — удвая таньней за «Паркінг», што ля Камароўкі. Мэталаканструкцыі вырабяць у Маладэчне.

### Паркоўка на аўтамат-аплаце

**Усе менскія адкрытыя паркоўкі ў 2004 г. пяройдуць на аўтаматызаваную сыстэму аплаты.** Плаціць за паркоўку трэ будзе з дапамогай аднаразовых і шматразовых электронных картак, кшталту цяперашніх таксафонных, што будуць таксама прадавацца ў кіёсках.

### Справаздача пра гандаль зброяй

**Асноўныя пакупнікі беларускай вайсковай тэхнікі і зброі — Іран, Кот-д'Івуар, Судан і Альжыр.** Аснову продажаў складаюць танкі, БМП, артылерыйскія сыстэмы. Гэта зьвесткі з Нацыянальнай справаздачы пра палітыку экспартнага кантролю і экспарт зброі. Беларусь першай у СНД рыхтуе такія справаздачы.

**МБ; БелаПАН**

## СЬВЕТ

### Рэкордныя выдаткі на абарону ў ЗША

**У 2004 г. ЗША выдаткуюць на вайсковыя патрэбы рэкордную суму — 401,3 млрд даляраў.** Заробкі вайскоўцаў вырастуць на 4%. Грошы таксама пойдуць на закуп самалётаў-запраўшчыкаў, распрацоўку новых тыпаў атамнай зброі і павышэньне пэнсій адстаўнікам. Больш за 9 млрд даляраў прызначаецца на сыстэмы абароны ад балістычных ракетаў. Дэмакраты крытыкуюць такі бюджэт, лічачы яго разьдзьмутым.

### Беларусы Расеі асымілююцца

**Этнічныя беларусы ў Расіі па колькасьці займаюць 9-е месца сярод 160 нацыянальнасьцей, што пражываюць у краіне.** Гэта вынікае са зьвестак перапісу 2002 г. З 145,2 млн жыхароў Расеі беларусы складаюць 814,7 тыс. чалавек. У 1989 г. у Расеі жыло 1206,2 тыс. беларусаў.

### Праваслаўныя атэісты нязводныя

**Прафэсар Інстытуту Эўропы Расейскай акадэміі навук Дзьмітры Фурман апублікаваў вынікі сацыялягічнага дасьледаваньня рэлігійных перакананьняў жыхароў Расеі, праведзенага ў 2000 г.** 80% жыхароў краіны назвалі сябе праваслаўнымі. Пры гэтым толькі 59% апытаных заявілі, што вераць у Бога. Калі ўлічыць, што сярод іх немалая частка людзей іншых вызнаньняў, выходзіць, што значная доля насельніцтва — тых самых знакамітых праваслаўных атэістаў.

**ФС**



# Не патрэбныя нікому, апроч вуліцы

У Беларусі цяпер тры калёніі для непаўналетніх хлопцаў — адна ў Бабруйску, дзьве ў Віцебску. Дзяўчат утрымліваюць у спэцыяльным участку Гомельскай калёніі для жанчын. Хлопцаў ад 15 да 20 гадоў у няволі паўтары тысячы, а дзяўчат такіх толькі трыццаць на ўсю Беларусь. Вялікая колькасьць непаўналетніх — з праблемных сем'яў, шмат хто — зь няпоўных сем'яў (самотныя маці). А часам бацькі папросту не рэгіструюць разводу, хоць у сям'і няма ніякіх сувязяў ні паміж мужам і жонкай, ні зь дзіцем. Ускосна гэта пацьвярджаецца тым, што да падлетка ў калёнію ніхто ня езьдзіць. Бацькі не падтрымліваюць кантакту. Ім не стае ні душэўных рэсурсаў, каб любіць сваё дзіця, ні матэрыяльных, каб спакаваць перадачу.

Большасьць дзяцей зьдзяйсьняюць злачынствы супраць маёмасьці, а ня супраць асобы. Гэта крадзяжы, а не забойствы ды згвалтаваньні. Прычым не адразу падлеткаў садзяць за краты. Іншая справа, што службы, закліканыя працаваць з праблемнымі падлеткамі на волі, сваіх функцыяў не выконваюць. І падлетак, не датрымаўшы выпрабавальнага тэрміну, зьдзяйсьняе новае правапарушэньне і трапляе ў калёнію.

Юнымі правапарушальнікамі займаецца інспэкцыя ў справах непаўналетніх, падразьдзяленьне МУС. Зь дзецьмі працуюць міліцыянты. А патрэбна, каб працавалі найперш псыхолягі і сацыяльныя пэдагогі. Падлеткі траўмаваныя сваёй непатрэбнасьцю, адсутнасьцю любові да сябе. Псыхолягі павінны працаваць ня толькі з падлеткам, але і з асяродзьдзем — сям'ёй, школай, кампаніяй. Каб аднавіць асобу, трэба выправіць яе адносіны са сьветам. Усё гэта ўсклалі на інспэктараў у справах непаўналетніх. Але яны загружаныя апэратыўнай працай, вышукам, ім фізычна не стае часу на прафіляктычную працу з падлеткамі.

Калі непаўналетні ўчыняе правапарушэньне, гэта адразу ставіць «птушачку» на школу. Адразу ж на яе сыплюцца праверкі, школу фіксуюць ва ўсіх справаздачах, дырэктара прыгадваюць ня ў самым лепшым кантэксьце. У выніку школа хавае правапарушэньні непаўналетніх ад інспэкцыі. Калі ж інспэкцыя ўсё-ткі ставіць парушальніка на ўлік, школа імкнецца пазбавіцца ад такога вучня. Сям'я праблемная, інспэкцыя не спраўляецца, школа выштурхоўвае. Чалавек апынаецца ў вакууме. Адзінае асяродзьдзе, якое яго прымае, — вуліца. Яна выкарыстае падлетка напоўніцу.

**Невыноснасьць цеснаты, а ня грубасьць адміністрацыі сталіся прычынай бунту ў Віцебскай калёніі.**

Начальніца Гомельскай калёніі распавяла, што падлеткі і жанчыны, якія там адбывалі пакараньне, пасьля пішуць, прыязджаюць. Бо працаўнікі калёніі — першыя людзі, якія праявілі цікавасьць да іх. Падлетак чакае любові і інтарэсу. Калёніі дастаткова ўкамплектаваныя настаўнікамі, дактарамі і выхавальнікамі. Няма і вялікай перанаселенасьці. Умовы ўтрыманьня параўнальна неблагія. Але грамадзтва мусіць усьвядоміць: ня варта зьбіраць тры-чатыры сотні праблемных падлеткаў у замкнёнай прасторы. Іх праблемы зьбіраюцца і даюць выбух, як гэта было ў Віцебскай калёніі.

Цяпер там шмат што зьмянілася, у тым ліку адміністрацыя. Але тэрыторыя калёніі вельмі маленькая. Гэта будынак у цэнтры гораду, побач — садок і школа. («Дзіцячыя ўстановы на любы густ», — змрочна жартуе начальнік калёніі.) Уявіце: вы жывяце з чужымі людзьмі ўшасьцёх у аднапакаёўцы і нікуды не выходзіце. Кожную гадзіну, кожную хвіліну вы бачыце адныя і тыя ж твары. Карпусы абцягнуты калючым дротам, пляцовачкі, куды дзеці выходзяць пагуляць, — мэтраў 12 на 7. Асабістая прастора адсутнічае зусім. Для чалавечай псыхікі гэта невыносна. Якраз невыноснасьць цеснаты, а ня грубасьць адміністрацыі сталася прычынай бунту ў Віцебскай калёніі.

Натуральна, можна сказаць: падлеткі ведалі, што робяць. Але, па-першае, нашто калечыць псыхіку й выпускаць у грамадзтва такую колькасьць пакалечаных людзей? Па-другое, як бы гэта дзіўна для дарослых ні гучала, падлеткі ня ведаюць, што так будзе. І нават экскурсіі школьнікаў у папраўчыя ўстановы не даюць плёну. Нельга выхаваць на чужых пакутах. Асаблівасьці псыхікі непаўналетніх у тым, што, выходзячы з калёніі, яны хутка сьціраюць з памяці ўсё, што там было. Па-трэцяе, выпрабаваньні яны ўспрымаюць як рамантыку. Па-чацьвёртае, яны няздольныя прааналізаваць тое, што зь імі адбываецца.

Людзі, якія працуюць у дзіцячых папраўчых установах Захаду (напрыклад, Даніі ці Швэцыі), абавязаныя кожны месяц праходзіць 25-гадзінны псыхалягічны трэнінг з кваліфікаваным псыхолягам. У нас кваліфікаваных псыхолягаў зусім няшмат. Трэнінгаў з супрацоўнікамі калёніі няма. І яны суткі праводзяць з падлеткамі — растарможанымі, псыхічна зьмененымі. Працаўнікі калёніяў зьдзяйсьняюць подзьвіг. Вядома, дзе няма нармальных умоў працы, там людзей змушаюць да гераізму. Гераізм у працы — адмоўная зьява. Ён адваротны прафэсіяналізму.

**Алеся Карнейчык**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Алеся Карнейчык — супрацоўніца лябараторыі сям'і Нацыянальнага інстытуту адукацыі, спэцыялістка па ювэнальнай (дзіцячай) юстыцыі, кіраўніца праекту «Падлеткі ў зьняволеньні», падтрыманага TACIS. Спн.Карнейчык аб'езьдзіла ўсе калёніі для непаўналетніх і дамы-інтэрнаты ў краіне.**

# Тры месяцы да будучыні

Я яшчэ не дарослы, але ўжо і не дзіця. Я — злачынец.

Страшна пісаць, але тут, у калёніі, мне добра.

Бо што я вынес зь дзяцінства? Хіба ж я ведаў цяпло блізкіх мне людзей? Мае бацькі ня вельмі шанавалі працу. Яны больш любілі гарэлку. Як толькі я нарадзіўся, то бацькоў маіх за п’янства выгналі з работы. Не было грошай, каб купіць мне нават пялюшкі. Бацькава маці забрала мяне да сябе ў вёску Салацьце, а цётка, бацькава сястра, замяняла мне маці. Мне тады было 3 месяцы. Так мінуў год. За гэты час бацькі мяне ні разу не наведалі.

Аднойчы бацька прыехаў і, пагражаючы цётцы, што спаліць яе хату і ўсіх пастраляе, забраў мяне да сябе. Мне стукнула чатыры з паловай гадзікі, калі маці кінула мяне на бацьку, а сама зьехала з другім.

Бацька не працаваў.

Карміўся тым, што летам людзям хадзіў рабіць печы, крыў дахі, зьбіраў і здаваў у прыёмныя пункты грыбы, а зімой каму плёў кошыкі, а каму падбіваў абутак.

Бацька зразумеў, што зь дзіцем яму будзе цяжка, і зноў адвёз мяне да бабулі. Там была чыстая вопратка, ежа, тэлевізар, радыё. Ні п’янак, ні сварак штодзённых тут не было.

> Потым мне казалі, што бацька не заслугоўвае маіх сьлёз. Як яны маглі так аб ім тады гаварыць! Ён жа быў маім бацькам.

Цётка заўсёды давала мне самае лепшае, бо яна ведала, што я гэтага з бацькамі ня меў. Але калі ў мяне запыталіся, дзе мне лепш жыць, я адказаў, што ў таты.

Кожную зіму бацька прыяжджаў да бабулі, як мядзьведзь у бярлог. Спаў, еў і нічога не рабіў. А калі сыходзіў сьнег і пачыналі расьці грыбы, ён зьнікаў. Так я жыў да 7 гадоў. Потым мяне зноў забраў бацька, я гатоў быў пайсьці зь ім хоць на край сьвету. Але жыцьцё маё зь ім было невыносным. Я хадзіў ужо ў першую клясу, пасьля школы ішоў з бацькам у лес па дровы, там рэзалі і везьлі на сабе дахаты. У краме бацька купляў крупы, хлеб і больш гарэлку. Бывала, што напіваўся і выганяў мяне з дому. Зімой я прасіўся да суседзяў, прасіў хлеба ў іх, часта хаваўся ад бацькі на гарышчы хаты.

Летам адчуваў сябе лепш. Лазіў па людзкіх агародах, краў агуркі, памідоры, капусту, яблыкі. Краў усё, што можна было зьесьці. Школу я наведваў рэдка, больш прагульваў. Ня мог пайсьці і да бабулі, бо бацька пагражаў ёй, што засячэ, спаліць яе разам са мной. Дырэктар школы і ўчастковы хацелі мяне адправіць у інтэрнат. Але для гэтага трэба было пазбавіць бацькоўскіх правоў майго тату. Многа раз ён прасіўся на судзе, што кіне піць, будзе глядзець свайго сына, яму верылі. Але ўсё зноў пачыналася спачатку.

Бацька біў мяне, здавалася, ні за што. Біў так, што я, бывала, і легчы на сьпіну ня мог. Але я яго па-ранейшаму любіў. Часам прыходзілі думкі, што ён мяне трымае як рабочую сілу, як раба. Мне ж хацелася пяшчоты і чуць добрае слова, але, мабыць, ён ня ведаў аб тым, што можна любіць сваё дзіця, а можа, не хацеў ведаць. Памятаю, як я захварэў і мяне паклалі ў бальніцу. Бацька за паўмесяца ні разу не прыехаў, хаця я яго чакаў штодня.

Затым я вучыўся ў школе-інтэрнаце санаторнага тыпу. Упершыню я правучыўся ў чацьвертай клясе, не прагульваючы ўрокаў. Але вучыўся дрэнна, бо я амаль нічога ня ведаў. Далей мяне пераводзілі з клясы ў клясу з горам папалам. Школа жыцьця, якую я засвоіў ад бацькі, дала свае ўсходы. Я ўжо навучыўся курыць, піць гарэлку, а матам крыў, як дарослы. Зладзіць са мной з кожным днём станавілася цяжанька.

І настаўнікі, і выхавацелі ўгаворвалі мяне, даказваючы, што ў інтэрнаце я чысты, сыты, абуты, гляджу тэлевізар, чытаю кнігі. Але мяне цягнула на волю; ведаў, што там буду галодны і халодны, але хацелася бацькавай увагі. Мае мары-жаданьні разьбіваліся аб інтэрнацкую сьцяну, бо на выхадныя мяне ніхто так і не забіраў.

Крадзеж не прывёў мяне да дабра, у 13 гадоў я патрапіў на лаву падсудных. Але тады мяне пашкадавалі і не адправілі ў спэцшколу. Урокам гэты выпадак мне ня стаў. Я зноў узяўся за крадзеж. Я быў малы і худы і мог пралезьці ў любую шчыліну — такім чынам я пранік у кафэ. Адтуль вынес шакалад, цукеркі, пірожныя і душыўся імі аж два тыдні. Затым ноччу я залез у ларок. З галадухі зьеў на месцы рулет, тры шакалядкі. Пачуўшы крокі, кінуўся бегчы, але быў затрыманы ўчастковым. Ён прывёў мяне ў аддзяленьне міліцыі і склаў пратакол. На наступны дзень я павінен быў прыйсьці з бацькам. Але я не прыйшоў. Кінуўся ўцякаць. Усім казаў, што да мамкі іду. Людзі мяне кармілі, дазвалялі пераначаваць. Празь месяц я быў затрыманы аж у Слаўгарадзе, адтуль быў дастаўлены ў Магілёўскі прыёмнік-разьмеркавальнік. Празь месяц прыехаў інспэктар па справах непаўналетніх і забраў мяне ў Горадню.

Мяне адвезьлі ў турму.

Калі адчыніліся дзьверы ў карантын, я дрыжаў ад страху. На верхняй нары я ўбачыў татуяваную сьпіну, ад якой зрабілася яшчэ больш жудасна.

Мне хацелася выскачыць, пабегчы куды-небудзь, але дзьверы ўжо зачыніліся. Мяне пазваў да сябе зэк па мянушцы Камар, стукнуў па карку і сказаў, каб нічога я не баяўся. У турме мне было цяжка, хацелася на волю, бывала, плакаў па сваіх. Мяне асудзілі на тры гады, так я трапіў у выхаваўчую калёнію №2. Адбываючы свой тэрмін, я пісаў дадому, што, калі выйду, буду паслухмяны і ніколі ня буду больш красьці. Датэрмінова я ня мог вызваліцца, бо бацька не высылаў мне патрэбных даведак. У калёніі я пражыў два гады, адзін год зьняла амністыя.

Тут я скончыў 9 клясаў, у ПТВ атрымаў спэцыяльнасьць сьлесара-рамонтніка 2-га разраду. З калёніі мяне забіраў стрыечны брат на машыне. На КПП я забыў ад хваляваньня нават сваё прозьвішча, здавалася, што нанова нарадзіўся на сьвет. Ехалі да хаты сем гадзін. Мой бацька быў у бабулі, ён прамовіў: «Здраствуй, сынку!» — і заплакаў.

Ён вельмі пастарэў, стаў падобны больш да дзеда. Бабуля мая таксама плакала, яе худзенькі твар быў увесь у зморшчынах. Бацька зьняў з рукі гадзіньнік і працягнуў мне, кажучы: «Вазьмі, сынку! Гэта табе ад бацькі, які ніколі табе не купіў нават цукерак!..» Я зірнуў яму ў вочы і заплакаў. Гэта быў мой самы-самы радасны дзень.

Спачатку я пабыў у бабулі, а потым паехаў жыць да цёткі ў горад.



ВАСІЛЬ МАЗАЕЎ

Бацька, п’яны, пасварыўся з бабуляй і паехаў да сябе. У горадзе я аформіў пашпарт і пайшоў вучыцца на тынкоўшчыка-абліцоўшчыка. Але здарылася тое, да чаго я шчэ быў непадрыхтаваны.

Тады я быў у бабулі, калі прыехалі брат зь цёткай. Яны сказалі, што ад бацькавай хаты няма сьлядоў. Быў сакавік.

…Дзьверы ў сені былі адчынены, стаяла жахлівая цішыня. Дзьверы ў хату былі замкнёныя, я ўзяў рыдлёўку і ўзламаў іх. Бацька ляжаў нежывы на падлозе, на стале стаяла недапітая бутэлька самагону.

Я анямеў, пацяклі сьлёзы, ня ведаў, што рабіць. Шкада было бабулю, яна нядаўна перанесла інфаркт, а тут здарылася такое гора. Я пабег да суседзяў, каб пазваніць цётцы. Потым мне казалі, што бацька не заслугоўвае маіх сьлёз. Як яны маглі так аб ім тады гаварыць! Ён жа быў маім бацькам.

Усё быццам зноў пачарнела, жыцьцё страціла сэнс. Я зноў пачаў піць, стаў непаслухмяны. Разам зь сябрам зьдзейсьніў новае злачынства ў алькагольным стане. Зноў зьняволеньне. Я атрымаў два гады па артыкуле 205/2.

...Мне ўжо засталося тры месяцы. Спагнаньняў ня маю.

Вельмі шкадую, што я дарэмна трачу сваю маладосьць, што я слабавольны і не магу стаць самастойным, хацелася б больш не папасьці на лаву падсудных. А ці змагу? Свабода палохае мяне. Якім моцным чалавекам павінен быць я, каб не шукаць лёгкага хлеба?

Ці хопіць у мяне цярпеньня?

Ці змагу я ладзіць зь людзьмі?

Ці змогуць яны мне давяраць?

Я баюся сваёй будучыні…

Як вызвалюся, то абавязкова паеду дадому, дзе жыў мой бацька. Пакуль я знаходжуся тут, то хата пустуе. Буду рабіць рамонт, каб у мяне быў хоць які-небудзь куточак, дзе я мог бы прытуліцца і сагрэцца ў моцны мароз. Думаю, што з часам хата ажыве, будзе выглядаць ня горш за іншыя.

Я часта ўспамінаю бацькавы словы : «Сынку, мы з табой жывём бедна». А мне і цяпер становіцца сорамна за яго, бо ён не стараўся купіць што-небудзь, у яго нават радыё не было.

Для сябе я зрабіў вывад, што жыць так, як мае бацькі, я ні за што на сьвеце не хачу. Я мару любіць жонку і сваіх дзяцей, працаваць дзеля сям’і. А хіба гэта ня шчасьце? Думаю, кожны са мной будзе згодны, што сям’я — гэта самы вялікі скарб у сьвеце і яе разбураць нельга.

Будзем спадзявацца, што ў маім жыцьці больш ня будзе недарэчнасьцей, усё, што магло адбыцца, адбылося. Я яшчэ малады. Жыцьцё толькі пачынае квітнець.

**Сачыненьне Івана Т.,**
**вучня 10 «А» клясы ВСАШ №5**
**выхаваўчай калёніі №2**
**Бабруйску**

ІМЯ Ў НАШАНІЎСКУЮ ЭНЦЫКЛЯПЭДЫЮ

# Шляхціц з–пад Ашмяны

**Працяг са старонкі 1.**

На пачатку свайго самастойнага жыцьця Ян Тарчэўскі быў даверанай асобай — камісарам, кіраўніком маёнтку Варата Санкт-Пецярбурскай губэрні Лугаўскага павету ў палкоўнічыхі Ганенфэльт (аднак нядоўга). Кінуўся ратаваць спуджаных коней, і палкоўнічыха яго звольніла: «Гэта павінны былі рабіць мужыкі, а ты ў мяне кіраўнічы». Неўзабаве вярнуўся на родную Ашмяншчыну.

Падчас рэвалюцыі 1905—1907 г. у Ашмяне і ў сваім засьценку Асінаўка праводзіў палітычную і агітацыйную працу, падымаў нацыянальную сьвядомасьць тутэйшага люду, ладзіў патаемныя сходы, вечарыны, дзе чыталі беларускія кніжкі, адозвы і іншую рэвалюцыйную літаратуру. Пашыраў на Ашмяншчыне «Нашу Ніву», пісаў у яе за рознымі псэўданімамі. Браў удзел у дыскусіі, якім шрыфтам друкаваць «Нашу Ніву». Вось пазыцыя гэтага «шляхціца з-пад Ашмяны»:

«Выпісваю тры газэты: беларускую, польскую і расейскую. Значыцца, чытаю ў трох мовах і, здаецца, не павінен я прыдаваць якую-колечы ўвагу да шрыфту. Але ўсё-такі стаю за лацінку і, каб «Наша Ніва» далей друкавалася гэтымі літарамі, даў бы 3 руб. замест 2 руб 50 кап. — а калі і гэтага мала, падпішуся адразу на 10 год, каб хаця дзеткі мае дачакаліся газэты ў тым шрыфце, у якім чытаем малітэўнікі. Мне б, папраўдзе, усё роўна, якімі літарамі чытаць, але ўсё-такі што забаронена, тое і бліжэй сэрцу, і смачней. Няможна вучыць дзетак на лацінскіх літарах, у школках таксама ня вучаць — дзеля таго і стаю за лацінку».

Як згадваюць сучасьнікі, Тарчэўскі не адзін раз быў у першых шэрагах розных маніфэстацыяў, якія праводзілі ў тую пару ў Ашмяне. Дух барацьбіта віраваў у Тарчэўскім.

Паводле слоў В.Пакульневіча, сябра КПЗБ, Тарчэўскі быў паліткатаржнікам. У 1911 г. Тарчэўскі спрабуе заняцца прыватным праўніцтвам на Ашмяншчыне, пра што сьведчыць копія даверчага ліста ад 15 студзеня 1911 г., выдадзеная ашмянскім


Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

Год VI. Вільня 24 Сакавіка (Марца) 1911 г. № 12.

НАША НІВА

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА З РЫСУНКАМІ

Выходзіць што тыдзень рускімі і лацінскімі літэрамі.

Адрэс рэдакціі і адміністраціі: Вільня, Віленская вуліца, д. № 20

Цэна з перасылкай і дастаўкай да хаты: на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес. — 1 р. 25 к., на 3 м.—65 к., на 1 мес. — 25 к. За границай: на 1 г. — 4 р., на 6 мес. —2 р., 3 мес. —1 р. Перэмена адрэсу — 20 кап.

Прыпамінаем усім падпісчыкам, каторые заплацілі грошы тольki за першую чэцьверць году, што пара прысылаць на ДРУГУЮ ЧЭЦЬВЕРЦЬ, бо іначэй высылка газэты з гэтым нумэрам скончыцца.

натарыюсам. Пры канцы 1915 г. Тарчэўскі ўжо ў Туле: разам з Т.Будзькам спрабуе заснаваць фотапавільён, фатаграфічную майстэрню. Аднак тульская гарадзкая ўправа не змагла забясьпечыць майстэрню электрычнасьцю. Тарчэўскі вяртаецца зноў на Ашмяншчыну, заводзіць сям'ю, займаецца гаспадаркай і асьветніцкай працай.

На пачатку 20-х, ужо пры Польшчы, ён апякуецца школьніцтвам, вучыць дзяцей беларускай мове, беларускай гісторыі, бярэ самы чынны ўдзел у розных беларускіх соймах, якія ладзіліся ў тую пару ў Вільні нацыянальнымі дзеячамі. Тарчэўскі быў кнігаром ашмянскай кнігарні Беларускага выдавецкага таварыства. Ставіў спэктаклі паводле п'есаў Аляхновіча — «Птушка шчасьця», «Страхі жыцьця». Блізкімі сябрамі яго былі ксяндзы Гадлеўскі і Станкевіч, а таксама вядомы заходнебеларускі дзяяч Стэфановіч.

На нацыянальны грунт Тарчэўскі прыйшоў праз творчасьць Францішка Багушэвіча, быў парадпёны з Багушэвічавым родам, меў шлюб з Марыяй, дачкой Францішкавай сястры Ганны. Багушэвічаву асобу лічыў узорам служэньня Радзіме, узорам грамадзянства. Доўгі час у засьценку Тарчэўскага перахоўвалася Багушэвічава бібліятэка, сямейны Багушэвічаў альбом, мэдальёны зь імёнамі сьвятых, шпалеры...

Паводле нэкралёгу, зьмешчанага ў газэце «Bielaruskaja krynica» (30.V.1929), быў шчырым, беззапаветным працаўніком на беларускай ніве. За што не адзін раз цярпеў вобысы, рэвізіі, сядзеў у астрозе. Тарчэўскі быў шырока знаны на Ашмяншчыне і ў суседніх паветах як чалавек добрай душы і беларускі дзяяч яшчэ з часоў нашаніўскай пары. Як стары прадстаўнік на беларускай ніве...

Тарчэўскі знаў адно — Беларусь і да гэтага праз усё жыцьцё сваё імкнуўся. Маючы здаровы беларускі розум, не любіў і ўважаў за шкодную праяву падзел беларускага адраджэнскага руху на партыі, не хацеў фармальна належаць ні да аднае беларускае палітычнае партыі і ставіўся да іх нагэтулькі прыхільна, наколькі дадзеная партыя стаяла на грунце арыентацыі на Беларусь. Ён стараўся заўсёды аб'ядноўваць як беларускія палітычныя арганізацыі, так і паасобныя адзінкі, не баючыся публічна сказаць праўду ў вочы і найбліжэйшаму нават асабістаму прыяцелю, калі бачыў шкоднасьць ягонай дзейнасьці для справы беларускай.

Пахаваны Тарчэўскі на Ашмянскіх каталіцкіх могілках паблізу капліцкі. Першапачаткова надпіс на крыжы быў зроблены па-беларуску.

**Уладзімер Содаль**

# Выгляд збоку




**Ліндэр Райнэр. Гісторыкі і ўлада. Нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX—XX ст.** — Менск, 2003

Гэткую кнігу беларускі гісторык здолеў бы напісаць толькі празь якіх гадоў пяцьдзясят. Каб даць такі адстаронены агляд, беларускую гістарычную навуку трэба бачыць з адлегласьці — прасторавай ці часавай. Ці здолеў бы хто зь сёньняшніх гісторыкаў адкрыта сказаць пра шкодную міталягічнасьць «100 пытаньняў і адказаў з гісторыі Беларусі» альбо скрытыкаваць прэтэнзіі беларусаў на Касьцюшкаву спадчыну? Ліндэнру гэта даруюць: што возьмеш зь немца?..

Тэма дачыненьняў творцы й улады — вечная. Паддаецца ўладзе навуковец — гіне для навукі, не паддаецца — марнуе час на змаганьне замест творчасьці. Кніга Ліндэнра — і пра першых, і пра другіх.

Цікава прасачыць эвалюцыю поглядаў нашых гісторыкаў на генэзу беларусаў: у 1920-я — «найчысьцейшы з славянскіх народаў», пры канцы стагодзьдзя — «славянізаваныя балты». Ліндэр акрэсьлівае гэтыя зьмены як паступовы, але няўхільны шлях беларускай гістарычнай навукі «на Захад».

Распавед пра зьмены ў беларускай гістарычнай навуцы чытаецца як бэлетрыстыка з добра закручаным сюжэтам. Публіцыстычнасьць асабліва моцна адчуваецца ў апошняй частцы, прысьвечанай прэзыдэнцкаму пэрыяду ў Беларусі. І разам з гэтай лёгкасьцю аповеду — дзьве надзвычай важныя высновы: «Па-першае: адзінае савецкае бачаньне гісторыі сьцьвердзіла сябе ў Беларусі толькі пасьля атрыманьня ваеннага досьведу і канчатковага ўсталяваньня савецкага патрыятызму як інтэрпрэтацыйнай дактрыны сучаснай гісторыі. Па-другое: да другой паловы 40-х актыўнымі заставаліся гэткія гісторыкі, як Пічэта, што атрымлівалі адукацыю ва ўнівэрсытэтах царскай імпэрыі й доўгі час лічыліся «буржуазнымі нацыяналістамі». Яшчэ адна тэза, якая вынікае з кнігі Ліндэнра: у Беларусі палітызацыя гісторыі (альбо гістарызацыя палітыкі) дагэтуль застаецца актуальным фактарам. Прычым гэта датычыць гісторыі ня толькі апошняга стагодзьдзя, але й папярэдніх. Зрэшты, «адстароненасьць» сыграла зь Ліндэнрам і непамысны жарт. Кнігу Зьміцера Бядулі «Жыды на Беларусі» ён палічыў антысэміцкай.

За працу Р.Ліндэнра, якая выкліча не адну спрэчку, варта падзякаваць навуковаму рэдактару Генадзю Сагановічу, які ініцыяваў беларускае выданьне, і перакладчыку Лявону Баршчэўскаму — за рупнасьць падчас перакладу.

**Адам Воршыч**

Сустрэча з Райнэрам Ліндэнрам адбудзецца ў Беларускім ПЭН-цэнтры (вул.Казлова 7-101) у пятніцу а 19-й.

ДАСЛАНА Ў РЭДАКЦЫЮ



**Шеремет Павел, Калинкина Светлана. Случайный президент.** — Москва: Нюанс, 2003. — Накл. 5000 ас.

Гэтую кнігу з прадмовамі Барыса Нямцова ды Аляксандра Якаўлева выдаў фонд «За новую Беларусь». Кніга ўздымае тэмы карупцыйных афэраў, палітычных забойстваў і палітычных скандалаў, якія замоўчваюцца беларускімі ўладамі і дзяржаўнымі СМІ.

# Ізноў Пінігін

**Працяг са старонкі 1.**

Сумаваць ні героям спэктаклю, ні публіцы не даводзіцца. Гледачы сьмяюцца так, што ім ажно зводзіць скулы. Танец з трупам зрывае шчырыя воплескі, Зоя Белахвосьцік сьпявае а-ля опэрным голасам, муж Джэйн Роні (Аляксандар Вергуноў) сыходзіць са сцэны голым. Як той казаў, ёсьць што паслухаць, ёсьць на што паглядзець.

П'еса пастаўленая цудоўна, акторы на вышыні, майстэрства рэжысэра настолькі выкшталцонае, што яно не заўважнае для староньняга вока. На гэты радасны, яскравы спэктакль варта схадзіць, асабліва такой туманнаю парой году. Дзяцей на спэктаклі найбольш забаўлялі сцэны жарсьці, калі акторы з усяго маху кідаюцца на падлогу. Магчыма, гэта быў сямейны спэктакль...

**Марыя Салаўёва**

# Гомагенізацыя ад актора грамадзянскай супольнасьці

**Працяг са старонкі 2.**

«На якой мове акторы грамадзянскай супольнасьці фармулююць зьмест, не павінна быць абстрактным прынцыповым пытаньнем. Абсалютна абыякава, будзе гэта сфармулявана па-расейску, па-беларуску альбо па-ангельску, абы адрасаты гэта зразумелі. Выступаючы за паляпшэньні ў розных галінах, акторы ня маюць патрэбы ў пэўных народных танцах, кнігадрукарах з XVI ст. і векавых этнічных каранях — ім патрэбныя зусім іншыя крытэры. Дэмакратыя пачынаецца з індывідууму і патрабуе адкрытасьці, крэатыўнасьці, плюралізму. Дэмакратыя дасягаецца не праз нацыянальную гомагенізацыю насельніцтва, а праз падтрымку пярэстай разнастайнасьці індывідуальных ідэнтычнасьцяў», — піша Баер у артыкуле.

Для сп.Баера пагроза гэтай разнастайнасьці зыходзіць ад беларускага нацыяналізму. Беларуская праваабаронцы разыходзіцца зь ім у думках і б'юць у звон пра лінгвістычную і культурную дыскрымінацыю носьбітаў беларускай мовы і ідэнтычнасьці. Часам нават выказваюцца думкі, што гэта прывядзе да поўнай асыміляцыі беларусаў і адпаведна, словамі Баера, да канчатковай «нацыянальнай гомагенізацыі» і без таго ўжо русіфікаванага, ці, дакладней, савецізаванага насельніцтва, толькі ў іншы бок. Баер пра такую пэрспэктыву ня згадвае. Дрымучае наведаньне ці палітычная перадузятасьць?

Відаць, першае, калі меркаваць з аргумэнтаў, якія прыводзіць аўтар. Напрыклад, ён упікае «нацыянальны рух» (для аўтара гэта ідэнтычна з БНФ), што той упусьціў магчымасьць забясьпечыць «падтрымку палякаў, якія пражываюць у Гарадзенскай вобласьці». Дазволю сабе проста сказаць сп.Баеру, што нацыяналіст Пазьняк атрымаў у населеным палякамі Воранаўскім раёне 35% галасоў пры сярэднім па краіне выніку 13%. Ясная рэч, «аўтар» абмяжоўваецца нямецкімі і парай англамоўных крыніцаў, а адзіная беларуская — хавайся ў бульбу — этымалягічна тлумачыць назву нашай краіны… асабліва сьнежнымі зімамі.

Усё гэта нагадвала б дрэнны жарт, калі б ня шыльда Фундацыі Эбэрта на вокладцы і прадмова кіраўніка бюро фундацыі ў Беларусі.

Беларускія ўдзельнікі прэзэнтацыі (Юры Хадыка, Мечыслаў Грыб) у рознай форме паддалі сумневу вывады немца.

Прэзэнтацыю азмрочыў вымушаны дэмарш Ніны Стужынскай, яшчэ адной аўтаркі кнігі. Яна пакінула залю на знак пратэсту супрацьтаго, што арганізатары нетактоўна запрасілі на імпрэзу і выканаўцу абавязкаў дырэктара Інстытуту гісторыі НАН. Як вядома, месяц таму Стужынскую звольнілі адтуль, як мяркуе яна, з палітычных прычынаў.

**Нягомагенізаваны**

## Прэтэндэнты на «Вялеса»

**Пачалося вылучэньне кандыдатаў на «Гліняната Вялеса» за 2003 год** — самую прэстыжную беларускую незалежную літаратурную прэмію. Сярод намінантаў — Уладзімер Някляеў з раманам «Лабух», Андрэй Хадановіч з кнігамі вершаў, Глёбус з «Сшыткамі» і паэтка Вера Бурлак (Джэці). Прэмія ўручаецца ў Полацку ў сакавіку.

**МБ**

## Парнасам Лысая гара

**20 лістапада ў кавярні Дому літаратара прэзэнтавалі зборнік «Літаратурны квартал».** Імпрэза «нечакана» супала з днём нараджэньня пісьменьніка Леаніда Дайнекі, кіраўніка фірмы — фундатара выданьня. Кніга — плён гадавое працы літаб'яднаньня, якім кіруе паэтка Людміла Рублеўская. 33 паэты зь яго могуць быць аб'яднаны пад лінкам «другое філялягічнае пакаленьне» — улічыўшы месца вучобы большасьці і піетэт да Лысае гары, куды суполка нават ладзіць вандроўкі.

На выданьне «Літаратурнага кварталу» накладам у тысячу асобнікаў кампанія «Белпі» — вытворца дарагога алькаголю — выдаткавала 4 млн рублёў.

**СМ**

# Вам слова, Джон Ячмень



P.L.A.N., 2003

«Мне ўжо 55 гадоў, а так шмат трэба зрабіць», — шчыра прызнаецца Андрэй Плясанаў, лідэр гурту «P.L.A.N.». Таму працуе музыка рупліва, як кажуць, душы паслухаючы, ужо другі альбом выдае сёлета. Выхад плыткі ледзь ня быў сарваны: кіраўнікі піўзаводу «Аліварыя» літаральна ў апошні момант адмовіліся фундаваць альбом. У песьнях «Маё пакаленьне» (рэмікс) і «Ой, Дуся, Дуся» кіраўніцтва бровару ўгледзела «палітыку».

Пачынаецца альбом зь вясёлага заклiку рабіць дзетак, ды «ня проста дзетак, а беларусаў» («Ой, Дуся, Дуся»), у «Тосьце пакрадзеных сьвятаў» робіцца спроба патлумачыць алькагалізм беларуса, які п'е за ўсе праявы жыцьця, «за тое, што збылося й не збылося». У песьні «Любоў важней за нянавісьць» (на верш Сяргея Законьнікава) выяўляецца мэта творчасьці Плясанава: «Я пяю ня проста каб народ забаўляці, а каб нешта ў душы абудзіці тваёй». Вядома ж, не абышлося без клясычнага рок-н-ролу: песьня «Rock and roll шанец» — гэткая мяшанка з тэкстаў Чака Бэры й Майка Навуменкі з дамешкам сваіх словаў — можа добра зарадзіць энэргіяй з раніцы.

З электрычнага гучаньня калі-нікалі музыкі пераходзяць у акустыку, гітарныя сола набылі новыя фарбы. Апошняе можна патлумачыць удзелам у запісе гітарыста Андрэя Дзяменцьева з групы «Калі Юга». Плясанаў ужо рыхтуе новы альбом, гэтым разам сольны, пад назвай «Пясэнкі саматнэга беларусіна», дзе будуць песьні як папольску, так і па-беларуску.

**Сяргей Будкін**

# Выгнаньне д’яблаў кулаком

## У Слоніме з шарлатанамі змагаюцца бацюшкі і манашкі ў цывільным

21 лістапада ў Слонімскім доме афіцэраў мусіла адбыцца сустрэча са «знахаркай Соф’яй», якая няведама адкуль прыехала ў горад над Шчарай. Напярэдадні «раёнка» зьмясьціла абвестку, што «знахарка», выкарыстоўваючы «шматвекавы досьвед свайго старажытнага роду знахароў», лечыць людзей ад цяжкіх захворваньняў, кшталту імпатэнцыі, дапамагае захоўваць спакой у сям’і, спрыяе посьпехам у справах і г.д. А галоўнае — плаціць за ўваход ня трэба. Вось і набілася поўная заля пераважна сталых людзей, якія спадзяваліся паправіць сваё здароўе. Але выйшла інакш.

Нечакана ў залю ўварвалася дэлегацыя праваслаўных бацюшак ды жанчынаў у строгім убраньні. Слонімскі сьвятар — айцец Уладзімер высока ўздымаў абраз і заклікаў «праваслаўных» разыходзіцца, бо зараз будуць «выганяць нячысьцікаў». Тых, хто застанецца, паабяцалі не адпяваць у царкве пасьля сьмерці. Палова людзей сышла, зьнікла і «знахарка Соф’я». У гэты момант у Дом афіцэраў прыехалі супрацоўніцы «Газэты Слонімскай» Вольга Шынкевіч і Тацяна Плахетка. Калі Плахетка пачала здымаць «выгнаньне нячысьцікаў» на лічбавую камэру, на яе наляцела з кулакамі каля сямі «манашак». Тры праваслаўныя сьвятары і не падумалі спыніць сысьцёр. Усё скончылася пасьля таго, як «манашкам» удалося сарваць лічбавую камэру і перадаць яе айцу Ўладзімеру. Той зьехаў у невядомым кірунку...

У найбліжэйшыя дні па факце здарэньня можа быць узбуджаная крымінальная справа. Судмэдэкспэртыза зафіксавала пабоі дзяўчат, а адну з нападніц удалося апазнаць — на адным з колішніх здымкаў яна ў манаскім убраньні йдзе сярод удзельнікаў хроснага ходу. Завадатар — айцец Уладзімер пакуль адмаўляецца адказваць на пытаньні сьледчага — кажа, што ня мае на гэта дазволу царкоўнага начальства. Лічбавую камэру ён перадаў у міліцыю — у ёй былі сьцёртыя амаль усе фатаздымкі.

Прычыны кідацца з кулакамі на журналістаў «Газэты Слонімскай» у праваслаўнага сьвятарства ёсьць. Неяк выданьне перадрукавала зь месячніка «ДСП» скандальнае інтэрвію праваслаўнага сьвятара Касьцюка пра сытуацыю ў духоўнай сэмінарыі ў блізкіх ад Слоніма Жыровічах. У горадзе казалі, што сотні асобнікаў газэты з гэтай публікацыяй скупляла праваслаўнае духавенства і паліла.

**Алег Тачоны, Слонім**

# Выстава ў Воршы


ГАЛІНА ЗЬМІТРУК

**Выстава пад назвай «Гістарычныя партрэты» адкрылася напярэдадні дня нараджэньня Караткевіча ў музэі пісьменьніка ў Оршы.** Свае жывапісныя і скульптурныя творы, прысьвечаныя выдатным асобам айчыннай гісторыі і культуры, выставілі Аляксей Марачкін і Алесь Шатэрнік. Абодва добра ведалі Караткевіча. Як адзначыў на вэрнісажы А.Марачкін, «ён быў для мяне ўзорам адданасьці і служэньня Беларусі». Мастак прэзэнтаваў створаны сёлета партрэт Караткевіча. Карціна, як мяркуецца, застанецца на радзіме пісьменьніка. Выстава ж будзе доўжыцца да 10 сьнежня.

**ВЛ, Ворша**

### У Полацку большае прыватных газэтаў

**На Полаччыне зьявілася чарговая новая газэта — «ART Проспект».** Пакуль што яна выходзіць накладам 299 асобнікаў, але яе заснавальнік, наваполацкі бізнэсовец, уладальнік клюбу «Night City» Артур Асновін плянуе зарэгістраваць у Міндруку сваё выданьне і ўключыцца на мясцовым інфармацыйным рынку ў барацьбу за чытача. Раней гэты пэрыёдык выходзіў дадаткам да газэты «Информ-плюс». Пасьля таго як «И+», самую масавую газэту Полаччыны (8 тыс. асобнікаў), набыў бізнэсовец Ўладзімер Захараў, стала зразумела, што «ART-у» давядзецца мяняць «месца дысьлякацыі», бо абодва гэтыя прадпрымальнікі маюць свае ўласныя інтарэсы ў гандлёвым бізнэсе. Рэдактар «ART Проспекта» Сяргей Балай паведаміў, што канцэпцыя выданьня будзе ранейшая: жыцьцё клюбу «Night City», расповеды пра эстрадных выканаўцаў, культурныя падзеі рэгіёну, навінкі відэа-, аўдыё- і кампутарных гульняў. Рэдакцыя газэты пакуль знаходзіцца ў стадыі фармаваньня калектыву, а асобнікі прадаюцца ў гандлёвых кропках сп.Асновіна.

У рэгіёне выходзяць таксама свая спартовая газэта «Овертайм» і яшчэ каля дзесяці інфармацыйных ды рэклямных газэт, працуюць два рэтрансьляцыйныя тэлеканалы «Квант» і «Скіф» ды адзін кабэльны — «Вэктар», FM-станцыя «Эўропа-плюс Полацак». Толькі дзьве мясцовыя газэты, «Полацкі веснік» і «Новая газета», зьяўляюцца выканкамаўскімі. Зь незалежных пэрыёдыкаў самы аўтарытэтны — газэта «Химик». Больш за 90% СМІ Полаччыны фінансуюцца зь мясцовых крыніцаў. Усё часьцей полацкі бізнэс укладае свае грошы ў сродкі масавай інфармацыі.

**Тамаш Гурба, Полацак**

### Рыжанкоў страляе і сьпявае



**У клюбе вёскі Вішоў з ініцыятывы кіраўніка мясцовага спартыўнага аматарскага аб’яднаньня «Алімпіец» адбылася сустрэча вяскоўцаў з чэмпіёнам сьвету па біятлёне Алегам Рыжанковым.** Спартсмэн разам зь сябрам па нацыянальнай зборнай адказваў на пытаньні, раздаваў аўтографы, фатаграфаваўся і сьпяваў разам з самадзейнымі артыстамі.

**Базыль Ліцьвіновіч, Бялынічы**

### Рамантуюць Купалаву дачу

**Пачалася доўгачаканая рэканструкцыя Купалаўскага мэмарыяльнага запаведніку ў Ляўках (Аршаншчына).** Згодна з энцыклапэдыямі, у кастрычніку павінны былі сьвяткаваца 25-я ўгодкі з дня яго заснаваньня (праўда, у кнізе водгукаў першы запіс зроблены наведнікамі не ў 1978, а ў 1977 г.). Дзякуючы сёлетняму аграмаднаму добраўпарадкаваньню разьмешчанага за 2 кілямэтры мястэчка Копысь — малой радзімы Лукашэнкі (гл. «НН», №41) — знайшліся грошы і для купалаўскага мэмарыялу. Ужо замененыя дахі некаторых будынкаў, сьцежкі брукуюцца пліткай, будуецца драўляная лесьвіца да Дняпра. Але пажадана, каб знайшліся сродкі для замены мармарна і фізычна састарэлай экспазыцыі музэю. Тэрмінова чакае кваліфікаванай дапамогі й цудоўная скульптура Янкі Купалы аўтарства Анатоля Анікейчыка. Хоць зь нядаўняга часу помнік і агароджаны, нейкая свалата выскрабла на сьпіне паэта расейскае мацернае слова.

**Віктар Лютынскі, Ворша**

### Множацца бяскрамныя вёскі

**Пасьля звароту жыхароў вёскі Чырвоная Дуброва ў раённую газэту праўленьне Бабруйскага райспажыўтаварыства згадзілася пачакаць з закрыцьцём мясцовай крамы.** Умовай існаваньня крамы — адзінага месца, дзе вяскоўцы могуць набыць хлеб, соль, цукар, — зьяўляецца падвышэньне яе рэнтабельнасьці. Гандлёвая кропка, якая месьціцца ў старым драўляным будынку, неаднаразова атрымлівала прадпісаньні аб закрыцьці ад пажарнай службы і міліцыі.

Стратнасьць ставіць пад пагрозу закрыцьця многія вясковыя крамы. Галоўная прычына гэтага — нізкая пакупніцкая здольнасьць вяскоўцаў.

**Людміла Кокаш, Бабруйск**

### Магістратура ў Горках

**Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія ў Горках першай сярод ВНУ вобласьці адкрывае ўласную магістратуру.** Паступіць сюды здолеюць студэнты, якія скончаюць БСГА на «добра» і «выдатна». Выпускнікі магістратуры атрымаюць дыплёмы магістраў дзелавога адміністраваньня па адным з чатырох напрамкаў — эканомікі, тэхніцы, біялёгіі і юрыспрудэнцыі. Навучаньне ў магістратуры абыдзецца кожнаму ў 600 даляраў.

**«Днепровская неделя»**

### Паляваньне на вуліцах

**107 укусаў дарослых і дзяцей сабакамі альбо катамі зарэгістравана за гэты год у Асіповічах.** Усе ўкушаныя былі вымушаны прайсьці доўгі і балючы курс прафіляктыкі шаленства.

**«Асіповіцкі край»**

### Перадкалядная знаходка

**У Баранавічах крамнікі пачалі рыхтавацца да Калядаў і Новага году нават раней, чым каталікі да Адвэнту.** Згодна з рашэньнем гарвыканкаму ўжо цяпер ва ўсіх крамах паразвешвалі ўпрыгожаньні і сьвяточныя плякаты. Некаторыя начапілі на дрэвы перад уваходамі электрычныя гірлянды.

Места пад гарадзкую ёлку таксама ўжо падрыхтавана. Сёлета 18-мэтровы камель яе будзе зьбірацца з мэталічных трубак, а галіны зробяць з 30 хвоек розных памераў. Летась, каб прывезьці ёлку зь Ляхавіцкага раёну, давялося выдаткаваць 10 млн рублёў і адключыць сьвятло на ўсім яе шляху да Баранавіч.

Каб усталяваць «мэталічную ёлку» на плошчы Леніна, пачалі былі сьвідраваць зямлю й капаць катлаван. Аднак на глыбіні зямля зрушылася, і рабочыя пабачылі дзьве труны — адну спарахнелую драўляную, другую жалезную. Якраз тутака, у цэнтры Баранавіч, раней знаходзіліся могілкі. У 1947 г. паводле рашэньня савецкай улады іх зьнішчылі, а на іх месцы паставілі помнік Леніну і гаркам партыі. Толькі апошнім часам, як бы ў пакаяньне, недалёка пачалося будаўніцтва праваслаўнай капліцкі.

Труны з парэштками нябожчыкаў перапахавалі на цяперашніх гарадзкіх могілках у Русінах. Брацкую магілу асьвяціў праваслаўны сьвятар.

Аднак у народзе кажуць, быццам гэта нейкі знак. Нібыта некалі памерлыя паўсталі перад намі, каб паказаць, што на іх костках штогод танчаць п’яныя месьцічы на розных сьвятах і маршуюць парады, праносяцца машыны і пасьміхаецца мэталічны Ільліч.

Але што нам да знакаў памерлых — Новы год на носе.



PHOTO.BYMEDIA.NET

### «Карытас» падтрымала бедных

**Каталіцкая арганізацыя «Карытас» Пінскай дыяцэзіі падтрымала харчамі (бульба, морква, капуста, фасоля і г.д.) баранавіцкія шпіталі, дзіцячы прытулак і малазабясьпечаных пэнсіянэраў.** Гародніну ніадкуль з замежжа не прывозілі — яе вырасьцілі пад Баранавічамі на ўзятай у арэнду зямлі супрацоўнікі «Карытасу» і валанцёры.

### Платнікаў пераносяць

**На пачатку году ў баранавіцкай паліклініцы застануцца толькі дармавыя паслугі.** Усе платныя перавялі за некалькі кварталаў на вул.Гагарына. Як кажуць, гэта робіцца дзеля клопату пра хворых. Той, хто ня хоча стаяць у чэргах, зможа, заплаціўшы, атрымаць паслугі хутка і якасна. Аднак калі бясплатных талёнчыкаў у паліклініцы ня будзе, давядзецца шываваць пехатой, каб атрымаць тое самае, але за свае грошы.

**Руслан Равяка, Баранавічы**

# Віктар Івашкевіч:
# Пэрыяд адпачынку сканчаецца

**Гэтае інтэрвію мае буйную загану: карэспандэнтка вызнае асабістую слабасьць да аб’екта. Нашаму знаёмству каля дзесяці гадоў. Віктар Івашкевіч быў тым, хто выцер нам, маладым нацыяналістам, сьлёзы пасьля ганебнага рэфэрэндуму 1995 г., дапамог перайсьці пустэльню сярэдзіны — канца 90-х. Гэты чалавек з воблікам караткевіцкага Дубатоўка быў адзіным, хто ніколі ня траціў веры, гумору, любові да простых і складаных радасьцяў быцьця.**

**Віктар размаўляе з кожным чалавекам — ці то бабулька-лукашыстка, ці то бабулька-франтаўка — на ягонай мове, прытым ніколі не мімікруючы. Ён той, хто не баіцца людзей. Ён той, хто ўсьміхаецца пад дыктатурай, на «хіміі» ў Баранавічах. Пацешна, што я патэтычна кажу пра чалавека, пазбаўленага ўсялякага патасу, усяго знарочыстага.**

**Я люблю Віктара Івашкевіча, бо ён нармальны й не паламаны нічым — ні ненармальнымі законамі, ні нармальным беззаконьнем, ні макабрычнай несправядлівасьцю й хаосам нашага часу. Такім я яго бачу й люблю. Таму інтэрвію можа падацца аднабаковым.**

**«НН»: Ну як жыцьцё кур’ерскае?**

**Віктар Івашкевіч:** Мой сын называе мяне «скараходам».

**«НН» (адсьмяяўшыся): Віктар, якім вы да нас вяртаецеся?**

**В.І.:** Вялікіх зьменаў са мною не адбылося. Адно што я меў час паглядзець на сябе збоку, найперш як на кіраўніка. Я ўбачыў, што трэба быць больш уважлівым да тых, хто табе падначалены. Бывала, што я роў і сварыўся, а цяпер зразумеў, як адчувае сябе той, хто ня можа адказаць тым самым. Другое — папрацаваўшы ў прафэсійнай газэце «Intex», я пазнаў хібы свае рэдактарскае працы. Я зразумеў — мне цікавейшая адміністрацыйная праца, а не журналісцкая. Мая задума — пайсьці працаваць ва Ўправу БНФ.

**«НН»: Кім?**

**В.І.:** Генэральным сакратаром (сьмяецца).

**«НН»: Хацелася б часьцей Вас бачыць на палітычнай сцэне.**

**В.І.:** Сакратар управы БНФ — публічная асоба. Іншая справа, што мая фактура не дазваляе мне заўжды быць на сцэне. Таму я хутчэй адміністрацыйны палітык, а не публічны, які бясконца выступае й павінен рэпрэзэнтаваць партыю, падабацца розным бабушкам і дзедушкам.

Трэба высьветліць юрыдычныя моманты — наколькі я буду абмежаваны ў правох пасьля пакараньня. Калі гэта юрыдычна магчыма, я буду ўдзельнічаць у парлямэнцкіх выбарах. Пайду абірацца ў Баранавічы.

**«НН»: Чаму акурат там?**

**В.І.:** Бо я там сядзеў (сьмяецца). Да таго ж да мяне бясконца езьдзяць візыцёры — амбасадар Штатаў, амбасадар Чэхіі, немцы-швэды-французы, з усяго сьвету журналісты й знакамітыя асобы. І «Intex» пра гэта пісаў, у кожным нумары красаваўся мой твар. І калі я ішоў-кур’ерстваваў па Баранавічах, людзі шапкаваліся са мною — «Жыве Беларусь! Рот Фронт! Но пасаран! А Вы ўсё яшчэ седзіце? Ох ды ха-ха» і г.д. І суцяшалі: вось вы тут седзіце, а мы тут усё жыцьцё жывём, і нічога. Баранавічы — не Сібір.

**«НН»: Гадоў дзесяць таму мы слухалі ў вас дома «Pink Floyd». Адна зь іхных п’есаў мае хвалевую структуру. І вы зазначылі: акурат як беларускі Рэнэсанс. Тады мы былі на грэбені хвалі, таму вам не паверылі. Ня верым і цяпер, калі разам з хваляй абрынуліся ўніз. А вы настойваеце на гэтым вобразе?**

**В.І.:** Дык грамадзтва як чалавек: пэрыяд узбуджэньня — пэрыяд апатыі. Арганізм так захоўваецца, каб не перагарэць. А тое, што пэрыяд адпачынку сканчаецца, — гэта дакладна. Людзі пачынаюць падымаць твары ад зямлі, глядзець у сьвет. І дарэчы, я не зусім гэта зьвязваю з пагаршэньнем жыцьцёвага ўзроўню. Гэта псыхалягічны момант. Рэвалюцыя 1991 г. была моцным шокам — былі рэзка зьмененыя арыенціры. А цяпер людзі ўвайшлі ў гэтыя каардынаты, абмацалі гэты сьвет, зразумелі яго й хочуць паляпшэньняў. Яны пачалі ўжо не баяцца зьменаў. Ну, і моладзь падрасла, якая не памятае таго шоку і заўсёды прагне новага. І гэтае жаданьне абнаўленьня хутка праявіцца. Незалежна ад таго, будуць падвышацца цэны ў «жыроўках» альбо не. Варта чакаць хвалю, толькі ніхто ня ведае дня.

**«НН»: А хто яе асядлае?**

**В.І.:** Лідэры грамадзтва ёсьць. Але бываюць часы, калі грамадзтву ня трэба лідэраў. Ну ня могуць жа яны навязаць сябе грамадзтву! А калі людзям трэба, тады зьяўляецца ачольнік. Ну, вось быў Пазьняк сорак зь лішнім гадоў не запатрабаваны ў лідэры, хто пра яго ведаў? Сядзеў фатограф, навуковы супрацоўнік. Мы, моладзевая арганізацыя, запрасілі яго выступіць на мітынгу ў абарону Верхняга гораду ў 1988 г. І пайшло, і пайшло… Цяпер жа лідэрам можа стацца кожны з палітыкаў, якіх мы ведаем. Патрэбны выпадак і жаданьне праявіцца. Мы кажам: гэта ня тыя, нам патрэбны ідэальны. А будзе неідэальны.

**«НН»: Як выходзіць, што вы заўсёды ўдзельнічаеце ў самых яркіх падзеях нашае гісторыі?**

**В.І.:** Я чалавек у побытавым сэнсе лянівы. Але маральна-псыхалягічны склад патрабуе ўдзелу ў рэвалюцыях. Дзіцем я чытаў пра Напалеона й думаў: вось гэта былі часы! Маё дзяцінства прайшло ў брэжнеўскую эпоху — суцэльная шэрасьць. Падлеткам я быў упэўнены, што тут ніякіх пэрспэктываў на яскравае жыцьцё няма, і раздумваў, як бы зьбегчы з СССР, каб патрапіць у нейкую бурлівую дзейнасьць на антыкамуністычнай глебе.



ЯЎГЕНІЯ ЯНУКЕВІЧ

**«НН»: У тыя ж гады я марыла патрапіць у часы грамадзянскай вайны, каб стаць камісаркаю, як Ларыса Рэйснэр. Альбо стацца мэдсястрою ў Аўганістане, каб лячыць «наших героических ребят». А як з вас атрымаўся юны антыкамуніст?**

**В.І.:** Атмасфэра ў сям’і была антыкамуністычная. Спэцыяльна мне нічога не казалі, дый ня трэба было. Я шукаў атмасфэру антыкамунізму і па-за сям’ёй. Нават гуляў зь нейкімі прыяцелямі ў кукклукс-клан. Падрос, зразумеў, што расізм — ня тое. Шукаў далей. І знайшоў — «Майстроўню», пасьля Фронт.

**«НН»: А ўсё ж чаму вашая сям’я не любіла камунізму? Івашкевічы, здаецца, шляхецкі род?**

**В.І.:** Адмыслова я не замаўляў дасьледаваньняў. Мой прадзед быў дробным шляхцюком, і, калі ў Імпэрыі былі разборы шляхты, у яго адабралі шляхецтва. Ён быў аканомам на фальварку. На пачатку XX ст. прадзед аднавіў дваранства, доўга дзеля таго пахадзіўшы па судох. У сям’і апавядалі, што на сьцяне ў хаце вісела грамата, але падчас гэтых рэвалюцыяў недзе згубілася. Я думаю, яе найхутчэй спалілі, каб не патрапіць пад рэпрэсіі камуністаў. Прадзед зь сям’ёю жыў у Менску. І па лініі бацькі я атрымліваюся мянчук у пятым пакаленьні. Дзед пад савецкай уладай быў рабочым на заводзе, бацька — інжынэрам. Дзед па матчынай лініі меў прозьвішча Пятрушын, быў заможным селянінам з-пад Вільні, праваслаўным. У 1914 г. яго мабілізаваў царскі ўрад, і ён ваяваў за цара, потым за Часовы ўрад, потым за Калчака. Ацалеў неяк. Калі пачалася другая сусьветная вайна, сказаў: хопіць, наваяваўся. І застаўся ў хаце, у Менску. Празь пяць дзён тут ужо былі немцы, таму мабілізацыі саветы зладзіць не пасьпелі. Перажыўшы гэтулькі войнаў і акупацыяў, ён пасьля вайны чакаў (казаў знаёмым), што амэрыканцы сюды прыйдуць, тады будзе лепей. Ён быў антыкамуністам яшчэ й таму, што з 1921 г. жыў у пасёлку Зялёны Луг. Штодня сям’я бачыла «варанкі» і чула расстрэлы. Перад вайной яго цягалі органы, бо ягоны брат празь мяжу сышоў у Польшчу. Вайна выратавала ад арышту.

**«НН»: Гэта цуд, што ён выжыў.**

**В.І.:** Самы большы й незваротны цуд адбыўся ў 1991 г. У выніку сапраўднай рэвалюцыі ўзьнікла дзяржава — Рэспубліка Беларусь. Без вайны, без крыві. Кроў пралілі нашыя папярэднікі, а мы атрымалі цуд. А цяпер Рэспубліка Беларусь перажывае пэрыяд падлеткавага станаўленьня. Усталяваньня маладое асобы. Нармальны складаны працэс.

**«НН»: Але ж дыктатура…**

**В.І.:** Усе забыліся, што такое сапраўдная дыктатура, сапраўдны таталітарызм. Маем вольны выезд за мяжу, а ў Адміністрацыі прэзыдэнта купіш «Народную волю». Дзе абзываюць прэзыдэнта. Дый я не ў Сібіры сядзеў. Са мной нават абыходзіліся добра, баючыся, што патрапіць мне шляя пад хвост, я забунтуюся і прымчацца амбасадары й журналісты.

**«НН»: І ўсё ж, што самае цяжкае вы перажылі за час зьняволеньня?**

**В.І.:** Неабходнасьць штовечару адзначацца: ісьці ў пастарунак і бачыць твары міліцыянтаў, якія зьдзекуюцца зь іншых людзей.

**Гутарыла Сьвятлана Курс**

Вось вы тут седзіце, а мы тут усё жыцьцё жывём, і нічога. Баранавічы — не Сібір.

Віктар Івашкевіч выйдзе на волю 16 сьнежня.

## ХРОНІКА СУПРАЦІВУ

У Заслаўі 23 лістапада за распаўсюд газэты «Супраціў» былі затрыманыя актывісты незарэгістраванай моладзевай арганізацыі «Зубр» **Любоў М.** і **Сяргей К.** У ГАУСе на іх склалі пратаколы за выраб і распаўсюд незарэгістраванай друкаванай прадукцыі і адпусьцілі. А потым зноў затрымалі: міліцыянты з аўтаматамі паведамілі, што з «зуброўцамі» захацеў пагаварыць начальнік ГАУС Сяргей Дзікевіч. Начальнік міліцыі абвінаваціў «зуброўцаў» у абразе прэзыдэнта: маўляў, падчас раздачы газэты крытыкавалі палітыку Лукашэнкі. 24 лістапада лідзкая друкарня без папярэджаньня адмовілася друкаваць беларускамоўную тэлегазэту **«Тэлескоп»**, спасылаючыся на несапраўднасьць дамовы. У Менску перад пачаткам акцыі «Мы супраць рэфэрэндуму» былі затрыманыя 4 маладафронтаўцы, падчас самой акцыі — яшчэ 17 чалавек. Заяўніка акцыі **Зьмітра Дашкевіча** судзьдзя Руслан Казадаеў асудзіў на 15 сутак арышту. **Алесь Запартыка** асуджаны на 5, **Васіль Парфянкоў** — на 15 сутак. На суд не зьявілася **Аксана Новікава**, затрыманая падчас акцыі. Непаўналетніх затрыманых удзельнікаў акцыі **Ігара Дзядкова**, **Ігара Касьцючэнку**, **Алега Гнедчыка**, **Руслана Харкевіча**, **Яўгена Ваўкаўца**, спн.**Вавёрку** адпусьцілі 24 лістапада ўвечары.

**АШ**

# Лісты з Поўначы

Славамір Адамовіч

**Працяг. Пачатак у № 42, 43.**

*Плохую лошадь со двора не сгонишь,*
*Но тот, кто хочет знать другую гладь,*
*Тот скажет: чтоб не сгнить в затоне,*
*Страну родную нужно покидать.*
С.Ясенін, «Пісьмо дзеду»

*Толькі што прыехаў аптэкар зь Менску.*
*Кажуць, бальшавікі больш за месяц не пратрымаюцца.*
Тэфі (Н.А.Лахвіцкая), «Зь дзёньнікаў ненапісаных»

## Ліст чацьверты. Лягер

Мілая, вось і год мінуўся з часу, як я зьехаў. Сёньня 20 верасьня, каторы дзень ільле дождж, ні ў грыбы-ягады пайсьці, ні на горы падняцца нельга, і хочацца скукобіцца, ужаліцца самому сабе на страчаны час, адзіноту... але, але ты ведаеш, як я ненавіджу *тоску а-ля рюс*; ува мне бунтуе ген вітальнасьці, таму ў любой сытуацыі, у самых неспрыяльных для духу і цела абставінах я вышукваю пазытыўныя аб'екты матэрыяльнага і нематэрыяльнага сьвету і высмоктваю, вылушчваю, вылізваю зь іх, калі на тое пайшло, энэргію жыцьця, такую неабходную мне для перастварэньня яе ў энэргію слова.

Днямі я пахаваў Лені, перажыўшы незвычайны энэргетычны катарсіс: быццам бы мне зрабілі пераліваньне крыві, так я аджыў. Бо я хаваў жанчыну, якая ў поўным розуме пражыла 101 год, перажыла XX стагодзьдзе і 11 верасьня ўбачыла катастрафічны ўдар па амэрыканізьме як modus'e vivendi. Лені Рыфэншталь — варты прыклад жыцьця напоўніцу.

І мы жывём, верасьнёвы грыбок мой, мая грыбніца, ваўняначка! Мы жывём нават тут, у лягеры!..

Першыя тры-чатыры месяцы, увайшоўшы ў сыстэму азюлю, я спадзяваўся адсекчы сябе ад *беларускага пытаньня*, пачаць жыць тэт-а-тэт з самім сабою, спрабаваў разьвітацца з сваімі любовямі, захапленьнямі, жарсьцямі... Але не туды тое, мне не ўдалося памяняцца самахоць; зь іншага боку, забыцца пра тое, адкуль я, вось ужо год не дае мне і маё лягернае атачэньне — савецкія бежанцы ўсіх згаданых мною ў папярэднім лісьце катэгорыяў.

25 кастрычніка летась я ступіў на тэрыторыю бежанскага лягеру Рогнан. Сустрэлі мяне настолькі шчыра, што ўвесь наступны дзень быў *вольны*: пад рыканьні расейскага поп-куміра пра бацяню-камбата я выдыхаў перабраную дозу азюлянцкай самагонкі-цукроўкі. Аднак ілюзія шчырага прыёму ў сям'ю савецкарасейскамоўных бежанцаў хутка разьвеялася: я аказаўся сапраўдным бежанцам з рэальным спадзевам на атрыманьне палітпрытулку сярод ста працэнтаў левых савецкіх уцекачоў (упырхлікаў, калі карыстацца беларускім наватворам апошняга часу). Мой статус, зь якім я паўстаў перад лягерным расейскамоўным інтэрнацыяналам, ня тое каб быў нецікавы, але раздражняў, асабліва *тожа беларусаў*. Таму, мая сьветлая, не пасьпеўшы раскрыць ракавінку сваёй душы, я мусіў хуценька згрэсьціся назад у сховы.

Найлепшыя ўспаміны засталіся пра ўзьбекаў Азіма ды Аліка — шматдзетных маладых бацькоў, якія шукалі ў Нарвэгіі толькі работы. Урэшце Аліка дэпартавалі ў Грэцыю, адкуль ён некалькі разоў тэлефанаваў, радасна паведамляючы, што ўжо капае траншэі за шасьцьсот даляраў у месяц. Азім жа ня вытрымаў лягернага сядзеньня і зьехаў у Осла, дзе яго ны сьлед губляецца.

Ад узьбекаў мяне перавялі ў пакой да маладога расейчыка — студэнта Саратаўскага авіяінстытуту. Гэты хлапчына дапамог мне адкрыць электронны адрас ды ўвесь час наварочваў на ангельскую.

Зьехаў і студэнт — на яго месца прыпёрся грузін Сярго вагою пад сто кіль, які на другі ж дзень па прыезьдзе вынес з тутэйшага маркету баранову нагу вагой кіль на шэсьць. Мясцовыя крамы бамбіў ён спрытна, нават нахабна, а вечарамі, распрадаючы крадзенае азюлянтам за паўцаны, падводзіў філязофскую базу пад свае




КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

паводзіны.

Увогуле самымі дзёрзкімі бамбістамі ў нашым лягеры былі і ёсьць грузіны ды армяне. Адміністрацыя добра ведае, хто крадзе, і тым ня менш далёка ня ўсіх дэпартуюць з краіны па гарачых сьлядах. Для таго каб цябе пасадзілі за краты, напэўна, трэба ўкрасьці мільён. За дробязі ня садзяць, аднак выпісваюць вялізныя штрафы. Чаму й не, калі ў грамадзянаў ёсьць чым плаціць.

Зь вясны 2002-га, калі лягер пачаў працаваць, да лютага 2003-га ў ім было каля 50 чалавек расейскамоўных. Азюль разьлягаўся ад савецкай папсы; «Брыльянтавую руку» ў кампаніі зь іншымі савецкімі блякбастэрамі глядзелі з раніцы да вечару; пэрманэнтна пілі самагнёт і лілі п'яныя сьлёзы па Саюзе Савецкіх — нават тыя, хто пры саветах пасьпеў толькі ў піянеры ўступіць.

Да лютага гэтага году ў лягеры канкуравалі чатыры самагонаварныя «сям'і»: хахол Вася-барыга, Вага-армянчык, нейкі кішынёўскі гагаўз ды казахстанскі беларус Вова-сямейны. Першым *зьелі* кішынёўскага (Вася-барыга здаў яго адміністрацыі, супрацоўнікі якой вылілі бражку і рэквізавалі рыштунак); потым дэпартавалі ў Грэцыю Васю. З надыходам вясны Вова-сямейны сам кінуў варыць самагон і пераключыўся на лоўлю рыбы (лавіў міногі й таксама прадаваў). Апошнім здаўся армянчык: ягоны самагонны бізнэс перакупіў грузін Сярго — пасьля таго, як мусова завязаў з крадзяжамі.

На сёньня ў лягеры самагнёту ніхто ня варыць, калі не лічыць запасаў майго чарнічнага віна, зь якім я зьбіраюся сустрэць тут яшчэ адныя Каляды.

Летась у лягеры дзейнічала школка: вучылі нас азам нарвэскай мовы. Але ўлады Нарвэгіі палічылі гэта завялікай раскошай і школку згарнулі. Затое падключылі парнаграфічны канал, і першыя месяцы два ля «Грундзіка» тоўпілася ледзь ня ўся мужчынская палова лягеру. Для мяне ж парнаграфія палягала не ў паказе даволі аднастайных каітусаў, семявывяржэньняў ды фальшывых усхліпаў, а ў

> Для мяне парнаграфія палягала не ў паказе даволі аднастайных каітусаў, семявывяржэньняў ды фальшывых усхліпаў, а ў штодзённых агульнадаступных рэпартажах з Іраку.

штодзённых агульнадаступных рэпартажах з Іраку, які *зачышчалі* высокатэхналягічнай зброяй салдаты кааліцыі. Вайна, мая даражэнькая, — вось сапраўдная парнаграфія; на жаль, сучасная цывілізацыя публічную дэманстрацыю зьнішчэньня сабе падобных ня лічыць брыдкай справай. Ты толькі падумай, наколькі фальшывая ды проста ўбога чалавецтва расставіла акцэнты: крайнюю плоць і жаданы язычок вульвы яно хавае ў цэні алькову, затое зь якім экстазам выстаўляе на ўсеагульны агляд прычындалы ўмярцьвеньня (усе гэтыя аргазьмічныя шыбеніцы, электракрэслы, гільятыны, газавыя камэры etc.)...

Але я адхіляюся ад нашай лягернай тэмы. Ты ведаеш, я ня толькі стваральнік, але й калекцыянэр усялякіх там дакумэнтаў эпохі. І вось адзін зь іх — няскончаны ліст Васіля-барыгі матцы ва Ўсходнюю Ўкраіну (у перакладзе з расейскай, з пунктуацыйнымі праўкамі).

«Мама, прывітаньне!

Мама, прабач мне, што пішу асабіста табе. Думаю, што толькі ты павінна мяне зразумець да канца ў маёй сытуацыі. Па тэлефоне ўсё не раскажаш, дорага. Па-першае. Чаму рашыў застацца ў Нарвэгіі. Нарвэгія — самая дарагая краіна Эўразьвязу. Гэта самыя высокія цэны на кватэры, машыны, у магазінах. Але менавіта таму тут самыя высокія заробкі. Але, каб пастаянна працаваць, трэба ведаць мову, хоць бы на пабытавым узроўні. Тры месяцы хаджу на падпольныя заняткі. Ужо ёсьць посьпехі. Каб працаваць пастаянна, патрэбны дазвол на работу, які выдаюць у паліцыі... Але галоўная бяда — гэта ведаць мову, чым я цяпер займаюся. І яшчэ галоўнае — трэба мець суму, якая ў любы момант можа спатрэбіцца, каб за ўсё аплаціць. Цяпер я маю часовую іншы раз працу…»

На гэтым ліст абрываецца. Пад часовай працай савецкі ўкраінец Вася разумеў, відаць, уласныя заняткі самагонаварэньнем, пра што маме ў лісьце пісаць не рызыкаваў.

Трапіў мне ў рукі яшчэ адзін характэрны ліст, які яскрава сьведчыць, што інстытут бежанства (ён жа Азюль, яна ж Сыстэма) прымае пад сваім разложыстым эўрапейскім дахам акрамя ўсіх іншых таксама і ахвяраў, і катаў, якія часта ў новым сваім статусе бежанцаў мяняюцца месцамі.

Юры Анатолевіч з Падмаскоўшчыны стаў у Нарвэгіі ахвярай. Думаю, аднак, што ягоная легенда занадта праўдзівая, каб быць рэальнай, і Анатольевіч, як і тысячы іншых азюлянтаў, прыехаў у краіну Паўночнага Шляху *па доўгі рубель*. Як ён сам распавядаў, у пошуках гэтага рубля валэндаўся чалавек увесь час — па поўначах і сібірах колішняга Саюзу; як добры зваршчык, зарабляў той рубель тысячамі, вахтавым мэтадам, і гэткім жа чынам — вахтава — спускаў савецкія чырвонцы на крымскіх югах, а што не прагульваў — аддаваў на радню, сам жа ня меў нават пастаяннай кватэры, ня кажучы пра суму на рахунку ў ашчадкасе. Пасьля каўкнуў СССР, абрынулася безграшоўе, на югах, дзе так бесклапотна гулялася, пачалася пошлая ў сваёй невынішчальнай дзікунскай традыцыі разьня. У выніку Юры Анатолевіч ужо трэці раз шукае ў Нарвэгіі прытулку і піша адвакату:

«Спадар Ёнсэн, дзень добры!

Прабачце, я хацеў бы зрабіць невялікі дадатак. У час інтэрвію праз хваляваньне, выкліканае неаб'ектыўнасьцю сьледчага і цяжкімі ўспамінамі, я многага ня змог успомніць. На пытаньне сьледчага, ці ведаю я імёны людзей, якія мяне выкралі, я адказаў, што не. Гэта праўда. Але цяпер я ўзгадаў імёны чачэнцаў, якія кіруюць у Чачэніі выкраданьнямі людзей (і ня толькі ў самой Чачэніі). Яны два разы прадавалі мяне ў рабства, вазілі на рынак рабоў ва Ўрус-Мартан. Гэта браты Ахмадавы — Рамзан і Ўвайс. Гэта — зьвяры. Некаторым закладнікам удавалася зьбегчы ад іх, іх шукалі і, калі знаходзілі, прывозілі ў Чачэнію і наладжвалі страты на вачох іншых закладнікаў. Аднаго мужчыну знайшлі аж праз паўтара году. Прывезьлі ў Чачэнію і адпілавалі галаву двуручнай пілой у нас на вачох.

І другі момант. На пытаньне сьледчага, дзе былі баі, калі я знаходзіўся ў бандзе рабом-насільшчыкам, я адказаў, што нас, рабоў, па перадавую не падпускалі, каб ня зьбеглі. Выганялі толькі пасьля баёў — хаваць трупы. Цяпер успамінаю, што самыя вялікія баі былі пад Ведзяном і Бамутам. Прыходзілася хаваць па 40—50 трупаў за дзень. Там жа я быў два разы кантужаны ад выбухаў мін і снарадаў. Ад пабояў і кантузіі ў мяне бываюць правалы ў памяці. Штосьці ўзгадваю, пачынае трэсьці, і тут жа зноў забываюся. Вось і цяпер трасе. Прабачце. Калі ласка, далучыце да справы пісьмы Танюшы, дачкі, і гэты мой дадатак. Юры Анатолевіч, з павагай!

**Заканчэньне будзе.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Сяргей Атрошчанка

**Уласьнік фірмы-вытворцы бялізны «Serge»,** абвесьціў пра жаданьне купіць кантрольны пакет акцыяў міжнароднага мэдыяхолдынгу «Golinger Int.», што выдае «Daily Telegraph» і «Jerusalem Post». Ніхто яму не паверыў.

Але рэклямны ход усім спадабаўся.

## Элеанора Язерская ў рэанімацыі

У аўторак яна трапіла ў 3-ці клінічны шпіталь з прабадной язвай 12-перснай кішкі, і ёй зрабілі тэрміновую апэрацыю. Стан яе здавальняючы.

Лепшае пісьменьніку **Ўладзіміру Арлову**, што таксама перанёс цяжкую апэрацыю.

## Сідорскі і адзін Мілер, Сідорскі і другі Мілер

**Сяргей Сідорскі** і **Лешак Мілер** сустрэліся ў Варшаве на сэсіі Цэнтральнаэўрапейскай ініцыятывы. Пасьля гэтага ў інтэрвію ТВ «Польсат» Сідорскі гучна заявіў пра тое, што Эўропа мусіць стаць адзінай і недзялімай. Што ўсе ўспрынялі як намёк на гатоўнасьць Беларусі далучыцца да працэсу эўраінтэграцыі. А ў сераду пасьля сустрэчы з другім Лёшкам Мілерам, толькі Аляксеем, з «Газпрому», заявіў: «Адзіная цана на газ — адна з умоваў стварэньня саюзнае дзяржавы». Пара б неяк вылечыць гэтую шызафрэнію. Калі хочаце будаваць саюзнае гаспадарства, тады разьвітайцеся з марай пра непадзельную Эўропу. Бо ж Нямеччына пад крылы пана Барадзіна ня пойдзе. Калі ж Вам хочацца ў Эўропу, тады няма чаго ждаць газу на дурня.

## Яніна Карольчык

**Яніна Карольчык** на два гады адхіленая ад удзелу ў спаборніцтвах. Знайшлі ў крыві меркаваны допінг. Хай бы яшчэ праверылі і «Советскую Белоруссию».

**Рой Мур**, судзьдзя Алабамы, пазбыўся пасады за тое, што не хацеў дэмантаваць уласнаручна ўсталяваныя ў залі суду каменныя скрыжалі з дзесяцьцю прыказаньнямі. Між тым Канстытуцыя штату аддзяляе царкву ад дзяржавы. У Францыі таксама — і нават з большым фанатызмам: у Бабіні пад Парыжам кабету-мусульманку, якая надзела ў судзе хусту, вывелі зь ліку прысяжных.

З **Франчэскам Пэтраркам** абышліся не па-людзку. Навукоўцы дасьледуюць яго парэшткі, каб налета, да 700-годзьдзя паэта, стварыць «як жывую» копію. А яна ж усё адно санэтаў ня будзе складаць.

**СМ**



«КП» У БЕЛАРУСІ



АЛЕНА АНДРЭЕВА

### ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

## Канцэрт Шалкевіча

**5 сьнежня ў менскім Палацы культуры вэтэранаў (вул Янкі Купалы, 21) адбудзецца вялікі канцэрт гарадзенскага барда і актора Віктара Шалкевіча.** Музыка будзе прэзэнтаваць новы альбом «За сто крокаў ад Вострае Брамы, альбо геаграфія ВКЛ і ваколіцаў». Пачатак у 19:00. Цана квітка ад 5000 да 7000. Даведкі і замова квіткоў: 649-08-88, 766-24-25.

## Адкрыцьцё помніка Ермаловічу

**28 лістапада на цэнтральнай плошчы Маладэчна** (200 м ад вакзалу па вул.Віленскай) **адбудзецца ўрачыстае адкрыцьцё помніка гісторыку Міколу Ермаловічу.** Сам помнік — камяніска з чырвонага фінскага граніту вышынёй 2,5 м з бронзавым барэльефам Ермаловіча, ганаровага грамадзяніна Маладэчна. Помнік выраблены на ахвяраваньні простых грамадзянаў.

## «Грыфаманія» ў хранічнай форме

**29 лістапада лепшыя беларускія гітарысты зьбяруцца разам, каб паспаборнічаць ды крыху выпіць.**

Упершыню ў гісторыі «Грыфаманіі» на сцэну выйдзе дзяўчына з электрагітарай — 20-гадовая Сьвятлана Пакліна. Як кажа арганізатар канцэрту Юры Рашэтнікаў, спачатку ўдзел Сьветы быў пад пытаньнем, але сумнеў быў разьвеяны, калі ён пабачыў фатаздымак гітарысткі.

Некаторыя гітарысты будуць упершыню браць удзел у фэсьце (Валер Песьляк, Аляксей Бумін з «Deadmarsh»), некаторыя зьяўляюцца вэтэранамі такіх мерапрыемстваў (Сяржук Трухановіч, Ігар Волкаў, Уладзімер Угольнік). У канцэрце таксама возьме ўдзел трыё «Big Val, Svet & Al», якія перамаглі сёлета на буйным блюзавым фэсьце ў Польшчы.

Больш чым трохгадзінны канцэрт распачнецца ў ДК МТЗ (вул.Даўгабродзкая, 24, мэтро «Трактарны завод») а 19-й. Цана на квіткі між 5000 і 9000 руб.

## Пазытыў ад «Камэраты»

**27 лістапада ў КЗ «Менск» мае адбыцца вялікі канцэрт вакальнай групы «Камэрата».** Калектыў выконвае добрую пазытыўную музыку. Пачатак а 19-й. Цана квітка — 4—10 тыс. руб.

**Сяргей Будкін**

### ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

Запрашаем на падарожжа ў **Пінск з заездам у Клецак 7 сьнежня** (нядзеля).

**30 лістапада** (нядзеля) «Сьвянцянскі край»: Камаі — Лынтупы — Камарова — Шэметава — Засьвір — Сьвір — Вішнева — Смургоні.

Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер) Т.: 264-12-38, 776-24-35 (Павал)

**ВІТАНЬНІ**

**Янку і Танечку Здоньчыкаў** з Днём народзінаў! Зычым радасьці, сьвята, чысьціні, Веры, Надзеі, Любові… Бацькі

**Віншую сваю матулю** Заяц Т. з Днём народзінаў. Жадаю ёй усяго найлепшага. Сын Алег

**Віншую Кандрацьева Валер'я** з Днём народзінаў. Зычу моцнага здароўя, шчасьця і посьпехаў у жыцьці. Ты павінен адрадзіць беларускі тэатар. Dzianis

**ВЕРШ**

Перад ружамі нат аўтамат у паклоне зьвінуўся.
Не з-за голак, праўда — дзеля нясьцерпнае чырвані кветак.
Бы дзікі сад увесну, народ нарэшце прачнуўся
Адчуўшы сябе ня ссохлым лісьцем, ня сьметнікам з зломкіх ветак.

Тыя сьцягі, што ў кожным сэрцы няспынна луналі,
Тысячы Данкаў уверх узьнялі, асьвятляючы шлях да свабоды.
Ружы ўквітнелі ў зямлі, ня ўгноенай трупамі; зельле, як звычай, праспала
Момант, калі звычайны народ раптам стаўся Народам.

**КАНТАКТЫ**

**Беларускія лекары** для Вас і Вашых дзетак. http://medicus.iatp.by

**Ліцэісты**, трымайцеся! Разам з вамі вучні школаў Маладэчна. Жыве Беларусь! Жыве Беларускі Ліцэй!

**Сяржук Лісічонак** + Зьміцер Дашкевіч = моцны Малады Фронт! Будзьце разам — і мы ўсіх зробім!!! Браты з МФ

**Марыі Салаўёвай**: насамрэч рэха — страшэнны прысуд. Mikita z IB

**Беларуская моладзь** — гэта сіла!!! Моладзевая зборная па футболе чарговы раз гэта давяла. Жыве Беларусь!

**Вітаньні** партыётам з Маладэчна. Змагайцеся за вольную Айчыну! Жыве вольная Беларусь!

**Прыму ў падарунак** фота гурту «Нэйра Дзюбель» ці фота А.Кулінковіча. Т.: 259-30-84

**Двое кацянятаў** (прыгожыя, выхаваныя, з пасагам) вельмі хочуць знайсьці сабе добрага, надзейнага гаспадара. Т.: 251-38-75

**Няма спасу** ад гомельскага ЗАЙЦА. КАПУСТА і ВЕРАС

**Патрабуецца памяшканьне** для клюбу ролевых гульняў у Горадні. Абяцаем паводзіць сябе прыстойна.Т.: (0152) 72-54-46

**Пазнаёмлюся** зь людзьмі, якія цікавяцца генэалёгіяй і геральдыкай. А таксама шукаю зьвесткі пра шляхецкія роды. Вул. Будаўнікоў, д.15а, кв.2, 225215, Белаазерск

**Цяпер** газэту «Партызанская» можна бясплатна атрымаць на сядзібе ТБМ (Румянцава, 13)

**Аналіз** эканамічных рэформаў у Беларусі — сучасны стан, пэрспэктывы. Т.: 8-029-672-27-18

**Змагайся за Беларусь** разам з намі. Збор штočацьвер у 19.00 каля ўваходу ў Купалаўскі тэатар

**Malitva** za Biełaruś – šlach da jaje adradžeńnia. Harantavana Boham. Padtrymajcie! Aleś

**Сродкі** для лячэньня анкалягічных хваробаў, антыаксыданты, для падвышэньня імунітэту прапаную. Т.: 8-029-766-12-79

**ПРАЦА**

**Нямецкая мова**: пераклады, кантрольныя работы, урокі. Т.: 202-61-03

**Рамонт** GSM тэлефонаў, правадных і радыёстанцый, факсаў, тэле-, відэа-, бытавой тэхнікі, кампутараў. Т.: 222-27-18

**Праца** за мяжой — гэта рэальнасьць. Для атрыманьня інфармацыі і анкеты дашліце капэрту з Вашым адрасам+заяўку. А/с 107, 210026, Віцебск

**ПАЗЫЦЫЯ**

**Купляю** пераважна беларускія — па моўнай прыкмеце — прадукты і тавары. Гэта складаны працэс — па віне вытворцаў. Але хай ведаюць! Беларус

**СЬВЯТЫ МІКОЛА**

**Дзеда Мароза** альбо сьвятога Мікалая (пажадана не дэбютанта) чакаюць 24 сьнежня на ранішніку ў менскім дзіцячым садку з маленечкай беларускамоўнай праграмай. Ганарар — прыблізна 15 даляраў. Патэлефануйце ў найбліжэйшыя дні: 283-27-43 (х), 690-04-20. Ірына Алейнік

**КНІГІ, МУЗЫКА**

**Куплю дорага** «Расейска-беларускі слоўнік» С.Некрашэвіча і М.Байкова — 1928. Т.: 275-49-59

**Гарадзенская выстава** «Ў Міхельсона» працуе кожны дзень, апроч суботы і нядзелі з 17 да 20-й. На выставе: беларуская музыка. кнігі, значкі з сымболікай і шмат іншага. Наш адрас: вул.Маркса, 11 (другі паверх). Т.: 72-35-61, 8-029-629-29-88 (Андрэй); http://michelson.by.ru e-mail: michelson@tut.by

### ТАКІНДАНГ



Прымаецца падпіска на першае паўгодзьдзе 2004 году. Падпісны індэкс 63125. Падпіску прымаюць ва ўсіх аддзяленьнях пошты, у шапіках «Белсаюздруку». Беларусь мяняецца, «Наша Ніва» застаецца. Дык падпісвайся!

Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

**Тэкст** ______________________________

______________________________

**Імя і прозьвішча** ______________________________

**Адрас, тэлефон** ______________________________

Наша Ніва

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| выпускны рэдактар | Арцём Лява |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск код 764.

Наклад 3428. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 22.00 19.11.2003.

Замова № 6350.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а